Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 473. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 60 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашпарэлі пасьперад тэксту 1 р. — к. За радок пашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпісныя на 50 проц. дарожэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Бесспрасўны і чырвонаармейцы — 4 „ За дакумэнт — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГСу—3 р.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 175 (2363) Аўторак, 31-га ліпеня 1928 г.

ВЯЛІКІ ШЛЯХ.

25 год таму назад стаў на моцныя гістарычныя рэйкі бальшавізм. На II зьезьдзе Расейскае сацыял-дэмакратычнае рабочае партыі былі закладзены асновы нашай партыі; тады-ж быў падведзен пад рэвалюцыйную барацьбу бальшавіцкі праграмны фундамант; тады-ж была намечана наша асноўная стратэгічная і тактычная лінія; тады-ж былі аформлены арганізацыйныя прынцыпы бальшавізму. Дата II-га зьезду азначае сабою адпраўны пункт вялікага рэвалюцыйнага шляху, насычанага агромаднае важнасьці гістарычнымі падзеямі, славутымі і гэраічнымі клясавымі бойкамі, найбольш цяжкай і суровай барацьбой за перамогу бальшавіцкіх ідэй. Гэты шлях вядзе і цяпер нашая партыя, будуючы сацыялізм у нашай краіне, вяўляючыся асяродкам і арганізуючым цэнтрам усясьветнага пралетарскага паўстаньня.

Наша партыя зарадзілася ў рабочых кварталах царскае Расеі. Яе калыскаю была хваля рабочага руху, які прарываўся, ня гледзячы на прыгнечаньне з боку самаўладзтва. Яе «няньками» былі мікалаеўскія фараоны апрычнікі. «Цацкамі», якімі яе ахвотна частаваў стары агідны лад, былі казацкія нагайкі, турэмныя казематы, высылка, катарга, а іншы раз і вадзейскія кулі. Невялікія прапагандысцкія рабочыя гурткі, спачатку распыленыя па асобных гарадох, аб'ядналіся ў адзіны моцны жалезны кулак цэнтралізаванае і дысцыплінаванае бальшавіцкае партыі,—партыі, якая дамаглася потым вялікае славы.

У вельмі цяжкіх умовах, заўжды ганімая, праследуемая агнём і мячом царызму, гэтая партыя выказвала выключную загартаванасьць і рэвалюцыйную вытрыманасьць, вяла сваю працу вельмі ўдала і паказала нам узоры пасьпяховае і пераможнае барацьбы ў сапраўды архіцяжкіх гістарычных абставінах. Яна рабіла сваю справу над крыжавым агнём прыгоньніцкае дэспотыі, „ліберальнае", контрэвалюцыйнае буржуазеі, шматкаляровага і розначасайнага апартунізму, ліквідатарства, меншавізму. І яна ніколі, ні пры якіх умовах, нават пад самым гураганам абстрэлу ворага, ня траціла свайго сьветлага і суровага рэвалюцыйнага твару: яна заўсёды заставалася вернай баявой партыяй пралетарыяту. Складаючы адно цэлае, непадзельнае з рабочай клясай, яна была заўсёды з ёй. Заўсёды была на чале яе. Заўсёды ўбірала ў сябе ўсё, што было і ёсьць у ёй лепшага. Заўсёды выхоўвала яе як адважнага кіраўніка і гегемона рэвалюцыі. І ў гэтай бязупынай і суровай барацьбе загартоўвалася і адточвалася нашая бальшавіцкая вброя.

На працягу свайго вядомага 25-цігадовага шляху наша партыя накапіла сапраўды вялізны баявы вопыт. Шумны прыбой хваляў пралетарскага руху пачатку 900 гадоў, высока ўзьняўшы рэвалюцыйныя грабяні 1905 году, гэтае „генэральнае рэпетыцыі" Кастрычніка, эпоха агідна разнузданае рэакцыі і вар'яцкае зьбянтэжанасьці, славутыя дні Лены, страшэнныя годы ўсясьветнае імпэрыялістычнае бойні з яе трупамі і шавіністскім чадам, люты, ліпень, потым бура Кастрычніка, грамадзянская вайна, будаўніцтва сацыялізму,—увесь гэты вялізарны шлях наша партыя прайшла з гонарам, з гонарам пранесла праз яго свой бальшавіцкі сьцяг.

Лепшыя, найбольш самаахвярныя людзі, лепшыя байцы-пралетарыі загінулі на гэтым цяжкім шляху, аддалі сваё здароўе і жыцьцё сваёй партыі. Да іх, верных і невядомых сыноў партыі, загінуўшых за справу рабочае партыі, схіляе свае пераможныя сьцягі наша Усесаюзная Камуністычная Партыя, адданая і непарушная калёна міжнароднай пралетарскай армії, магутнейшая рэвалюцыйная кагорта, кіруючая аграмаднаю дзяржаваю, ахапляючай шостую частку зямное кулі.

Вялікая моц нашае партыі—у яе адданасьці тэй клясе, на чале якой яна стаіць. Моц яе—у яе граніткай ідэйнай згуртаванасьці, на аснове вучэньня Леніна, у дасканалым злучэньні рэвалюцыйнае гнуткасьці і жалезнае арганізаванасьці, у непарушнай пралетарскай дысцыпліне. Вось чаму яна з поўным правам магла „адважыцца" на такое гістарычнае плаваньне, аб якім і ня сьнілася ніякім Калумбам чалавецтва.

25 год барацьбы і працы нашай партыі даюць узорны прыклад усім пралетарскім рэвалюцыйным партыям, усім сэкцыям Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Значэньне II-га зьезду і значэньне ўсяго нашага 25-цігадовага шляху выходзіць далёка за „расейскія" за эсэсэраўскія межы. Шлях нашае партыі ў глыбокім сэнсе гэтага слова інтэрнацыянальны. Усім рэвалюцыйным атрадам Камінтэрну можна і нават трэба шмат чаму навучыцца на вопыце нашае партыі.

Ад II-га да XУ-га зьезду і далей наперад пад кіраўніцтвам вялікага пралетарскага «провідца» Леніна, а пасьля яго—пад калектыўным ленінскім кіраўніцтвам,—цьвёрдым упэўненым крокам ідзе да новых боек і перамог наша партыя, непарыўнымі жывымі ніцямі зьвязаная з вядомымі датамі II-га зьезду. І няма сілы, больш грознай для ўсіх ворагаў пралетарыяту, для фашысцкіх дзяржымордаў, для ўсіх імпэрыялістычных гвалтаўнікоў, для агідных Іуд з жоўтага ордэну II-га Інтэрнацыяналу,—няма сілы больш грознай, чым наша бальшавіцкая УсесКП(б) і бальшавіцкі Камуністычны Інтэрнацыянал. Бо гісторыя сваё зробіць. З старое ленінскае „Іскры" разгарэлася чырвонае полымя Кастрычніка, а гэта рэвалюцыйнае полымя нямінуча разгарыцца ва ўсясьветны пажар камуністычнае рэвалюцыі.

Напад рабочых на вастрог у Ліможы.

(Дэманстрацыя ў Троайэ).

ПАРЫЖ, 28-VII. Паводле вестак ангэнцтва Гавас з Ліможы (на паўднёвым захадзе Францыі), работнікі пад кіраўніцтвам камуністаў зрабілі шматлікую дэманстрацыю і напалі на мясцовы вастрог з мэтай звальненьня работніка, якога арыштавалі ў сувязі з забастоўкай на фабрыцы абутку. Дэманстранты пасьпелі ўзламаць браму вастрогу раней, чым прыбылі жандары для навядзеньня парадку. Зараз вастрог заняты жандармэрыяй. Паводле вестак камуністычнай «Юманітэ», 3.000 работнікаў у Троайэ правялі магутную дэманстрацыю перад гмахам ратушы, пратэстуючы проці прысуду рэдактара мясцовай газэты на 18 месяцаў вастрожнага зьняволеньня і штрафу ў суме 1.500 франкаў.

Забастоўка маракоў.

ПАРЫЖ, 28-7. У адказ на адмову прадпрыёмцаў задаволіць дамаганьні рускіх мараноў, марані аднагалосна пастанавілі абвясьціць усеагульную забастоўку. Маракі пераважаючай большасьцю галасоў пастанавілі прылучыцца да ўнітарнай (рэвамоцыйнай) канфэдэрацыі працы. Забастоўка рускіх докераў ня спыняецца. Унітарная канфэдэрацыя працы апублікавала адозву, у якой заклікае работнікаў байкатаваць параходы, якія накіроўваюцца ў сувязі з забастоўкай у іншыя парты і дапамагчы бастуючым матар'яльна.

VI кангрэс Камінтэрну.

Спрэчкі па дакладу т. Бухарына.

Дзень 29 ліпеня г. г. кангрэс пасьвяціў спрэчкам па дакладу тав. Бухарына.

Тав. Чэн-Хуан (Кітай)

затрымліваецца на пытаньні аб паняваньні і канкурэнцыі імпэрыялістаў на Ціхім акіяне. Кітайская рэвалюцыя не разьбіта, яна жыве. Авангард рэвалюцыі—кітайская кампартыя — павінна зьвярнуць галоўную ўвагу пытаньням мабілізацыі шырокіх масаў. Тав. Чэн-Хуан уносіць прапанову адзначыць у тэзісах, што ў блізкім часе ў Кітаі наўхільны новы рэвалюцыйны ўздым.

Тав. Ульбрыхт (Нямеччына)

палёмізуе з тав. Эвэртам. Тав. Эвэрт перацэньвае капіталістычную стабілізацыю, пераўвялічвае сілы сацыял-дэмакратаў і пагадзьвальна адносіцца да правага ўхілу ў партыі. Задача партыі ліквідаваць правы ўхіл. Пасьля УІ кангрэсу мы спадзяёмся, што партыя будзе працаваць пры максымальным адзінстве сваіх радоў.

Тав. Ламінадзе (дэлегацыя ВКП)

лічыць небясьпеку вайны асноўным пытаньнем. Тав. Эвэрт недаацэньвае значэньня венскага паўстаньня, забастоўкі ў Англіі і посьпехаў нямецкай кампартыі на выбарах. Тав. Пэпер таксама зацірае пытаньне аб палявеньні эўрапейскай работніцкай клясы. Ён недаацэньвае ступені радыкалізацыі амэрыканскіх работніцкіх гушчаў. Тав. Ламінадзе крытыкуе навіцыю тав. Пэпэра ў кітайскім пытаньні.

Тав. Эрколі (Італія)

ад імя італьянскай дэлегацыі выказвае згоду в агульнай лініяй, адзначанай як у тэзісах, так і ў дакладзе т. Бухарына. У тэзісах павінна быць ясней сказана аб праблеме фашызму. Тав. Эрколі затрымліваецца на характарыстыцы с.-д. і адносінах да іх кампартыі.

Тав. Лаўстон (ПАЗШ)

напракае апазіцыю амэрыканскай кампартыі ў непразільнай ацэнцы развіцьця амэрыканскага імпэрыялізму. Меншасьць пераацэньвае значэньне цяперашняй дэпрэсіі ў ПАЗШ, якая зьяўляецца вынікам рацыяналізацыі, а не пачаткам заходу капіталізму. Мы канстатуем узрастаючае палявеньне амэрыканскай работніцкай клясы, але ня лічым, што гэты працэс носіць ужо такі ўсеагульны характар, які прабуе яму надаць апазіцыя.

Тав. Брандт (Польшча)

палемізуе з апазіцыяй меншасьцю, у прыватнасьці з тав. Ленскім, якога ён папракае ў апратуністыцы.

Тав. Бэнэт (Англія)

прапануе паказаць у тэзісах на загніваньне ангельскага капіталізму. Пытаньне аб рабочым імпэрыялізьме ангельскіх рэфармістаў заслугоўвае сур'ёзнай увагі. Працяг фракцыйнай барацьбы ў амэрыканскай кампартыі небясьпечны дзеля таго, што яно можа перарадзіцца ў барацьбу клікаў, у барацьбу проці партыі.

Тав. Міколас КП(б)У.

дае ацэнку здрады невялікай часткі лідэраў кампартыі Заходняе Украіны і крытыкуе тав. Ленскага, выступаўшага супроць большасьці ЦК польскай кампартыі.

Тав. Рэйман (Чэха-Славакія),

паражка чэха-славацкай кампартыі ў сувязі з «чырвоным днём» паказвае на наўпэўнасьць апартуністычнага ўхілу ў ЧКП. Камінтэрн павінен даць ясныя дырэктывы аб тым, што галоўную барацьбу трэба накіраваць супроць правых.

Тав. Махмуд (Індыйскі камсамол)

паказвае на вялікую работу, праробленую індыйскім камсамолам. У далейшым патрэбна ўзмацніць больш цесную сувязь з КІМ'ам і ангельскай кампартыяй.

Тав. Цыцэль (Нямеччына)

—намечаная эсэнскім зьездам кампартыі правільная лінія не заўсёды правільна праводзіцца ў жыцьцё. Цяперашняя палітыка партыі ў прафсаюзах і бюракратызацыя апарту асуджаюць на правал тактыку адзінага фронту. Наўпэўнасьць, хістаньне партыйнага кіраўніцтва—крыніца апартуністычных памылак. (Бурныя выяўленьні пратэсту на лавах нямецкай дэлегацыі). Самакрытыка і поўная канцэнтрацыя сіл павінны быць супроцьпастаўлены цяперашняму ўнутрыпартыйнаму курсу.

Тав. Хэрвік (Польшча).

Вострыя мерапрыёмствы большасьці кіраўніцтва польскай кампартыі супроць апазіцыі, асабліва ў Варшаве, а таксама адхіленьні кампрамісных прапаноў апазіцыі стварылі ў партыі сур'ёзнае становішча. Дзеля гэтага кангрэс павінен паклясьці канец цяперашняму нездароваму стану ў польскай кампартыі і даць ёй моцнае кіраўніцтва.

Тав. Грунбаум (Польшча—Зах. Украіна)

падтрымлівае правільную лінію ЦК ПКП, які вядзе барацьбу з левэй і правай небясьпекамі, в якіх апошняя зьяўляецца найбольш грознай. Так званая апазіцыя не адзін раз выяўляла апартуністычныя тэндэнцыі.

Тав. Шэнфэльдэр (Аўстрыя)

затрымліваецца на разнагалосьях, узьнікшых у аўстрыйскай кампартыі пасьля ліпнёвага паўстаньня.

Тав. Міцкевіч-Кансукас (Літва)

прапануе яшчэ да сканчэньня кангрэсу стварыць камісію для ліквідацыі крызісу ў польскай кампартыі.

Тав. Корчык (Польшча—Заходняя Беларусь).

Фракцыйная барацьба ў польскай кампартыі небясьпечная і шкодная, аднак кансалідацыя партыі магчыма толькі пры ўмовах ухіленьня правых памылак.

Тав. Піянэраў (кітайскі камсамол)

выказвае здавальненьне ў зьвязку з тым, што кангрэсу быў зроблены асобны даклад аб працы сярод моладзі.

Спрэчкі па дакладу т. Бухарына закончыліся ў суботу вечарам. Спрэчкі занялі 11 пасяджэньняў. Выказалася больш 90 прамоўцаў.

Пагроза непарадкаў у Эгіпце.

ЛЁНДАН, 29-7. Агэнцтва Рэйтэр паведамляе з Каіру: «Дэпутаты распушчанага эгіпэцкага парляманту і сэнату—члены Вафд (партыя эгіпэцкіх нацыяналістых) сабраліся ў прыватным доме і прынялі рэзалюцыю, у якой заяўляюць, што парлямант існуе і па канстытуцыі маг права рабіць пасяджэньні. Рэзалюцыя дамагаецца адстаўкі ўраду.

Сабраўшыяся падпісалі дэклярацыю, якая заяўляе, што ўсе законадаўчыя мерапрыёмствы цяперашняга ўраду і тыя згоды, якія могуць быць заключаны, ці ўжо заключаны ім, пазбаўлены моцы. Падпісаўшыя дэклярацыю клянуцца бараніць да апошняй кроплі крывы канстытуцыю.

* * *

ЛЁНДАН, 27-7. Эгіпецкі ўрад паведаміў лідэра нацыяналістаў Нахас-пашу, што ён будзе лічыць яго адказным за мітынгі і дэманстрацыі, якія могуць парушыць мір у краіне, і за вынікі, якія можа мець намер 135 нацыяналістскіх сэнатараў і дэпутатаў тайна сабрацца 28-га з мэтаю агаласіць сэнат законным парлямантам.

НОБІЛЕ АДМОВІЎСЯ ДАЦЬ ТЛУМАЧЭНЬНІ АБ ПАДРАБЯЗНАСЬЦЯХ КАТАСТРОФЫ.

КАПЭНГАГЭН, 29-7. У гутарцы з прадстаўнікамі друку па дарозе ў Капэнгагэн, Нобіле адмовіўся даць падрабязнасьці катастрофы і прабываньня ўдзельнікаў экспэдыцыі на ільду, спасылаючыся на адсутнасьць інструкцыяў з Рыму і на сваё становішча афіцэра, якое абавязвае яго раней усяго даць справаздачу ў Рыме. Мэханік эк-дыцыі Нобіле Чэчыоні хо[illegible] кастылёх. Правая но[illegible] лубку. Граф. Бэгоў[illegible] ехаць проста ў П[illegible] навуковыя назір[illegible] цэлымі.

Бэла-Кун выехаў у Ленінград.

ВЕНА, 28-7. Аўстрыйскае тэлеграфнае агэнцтва паведамляе: „З прычыны адбыцьця тэрміну кары, венскі суд перадаў Бэла-Куна паліцыі, якая адправіла яго звычайным хуткім цягніком у Люндэнбург, дзе перадала яго Чэха-славацкім паліцэйскім уладам. Чэха-славацкія паліцэйскія ўлады перадалі Бэла-Куна нямецкім уладам, якія адправілі

Шматтысячн[illegible] жанчы[illegible]

ЛЁНДАН[illegible] фальгар-Сс[illegible] тысячная дэманстра[illegible] рацьбы суп[illegible] прычынай [illegible] служылі [illegible] легацыі [illegible] СССР», домая д[illegible] ботніцк[illegible] Кэтлін[illegible] чай мір[illegible] зьяўляец[illegible] рабочым[illegible] рабо[illegible] праэк[illegible] еньня [illegible] ботні[illegible] ня ве[illegible]

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1-ай гадзіне ўночы).

ПАЛЬШЧА ЗНАХОДЗІЦЬ У ПРАМОВЕ ТАВ. БУХАРЫНА НА КАНГРЭСЕ КАМІНТЭРНУ ЎМЕШВАНЬНЕ СССР ВА ЎНУТРАНЫЯ СПРАВЫ ПОЛЬШЧЫ.

З часу апублікаваньня прамовы Бухарына на кангрэсе Камінтэрну, ў замежным друку, асабліва ў польскім, сталі зьяўляцца артыкулы і заявы аб тым, што гэта прамова зьяўляецца ўмешваньнем ва ўнутраныя справы Польшчы.

Па атрыманых ТАСС з аўтарытэтных колаў вестках, польскі пасланьнік Патэк, у часе наведаньня намесьніка Народнага Камісара па Чужаземных Справах т. Карахана, спрабаваў, ня гледзячы на ўсю неабгрунтаванасьць гэтых заяў, абаперціся на іх і нават знайсьці ў прамове Бухарына парушэньне Рыскае ўмовы. Паведамленьне аб гэтым было на днёх разаслана афіцыёзным польскім агэнцтвам і зьявілася ва ўсім польскім друку.

Тав. Карахан выказаў крайняе зьдзіўленьне з прычыны таго, што Патэк палічыў магчымым заявіць пратэст па зазначаных вышэй матывах. Пры гэтым Карахан напомніў, што савецкі ўрад ня раз растлумачваў, што Камінтэрн не зьяўляецца дзяржаўнай арганізацыяй, а ёсьць прыватная арганізацыя, утвораная партыямі, якія ў большасьці дзяржаў працуюць легальна. Тав. Карахан пры гэтым дадаў, што ёсьць факты, якія запраўды мяшаюць зблiжэньню між СССР і Польшчай і зазначыў на забойства Войкава, замах на Лізарава, а таксама на тую міласьцівую палітыку, якую польскія ўлады да гэтага часу вядуць у адносінах к белым эмігрантам, якія запраўды ставяць сваёй мэтай умешваньне ва ўнутраныя справы СССР.

ВАКОЛ КІТАЙСКІХ ПАДЗЕЙ.

Уражаньне ад кітайска-амэрыканскага дагавору,

ШАНХАЙ, 28-7. Нота Колёга жвава абгаварваецца друкам і грамадзкасьцю. Усе кітайскія і замежныя газэты прысьвячаюць ноце перадавіцы. Ва ўсіх артыкулах пераважаюць два моманты: у кітайскім друку—адкрытае здавальненьне і ўрачыстасьць, а ў ангельскім друку — пасляблёнае і спробы зьменшыць значэньне ноты і яе ўражаньне.

Орган ЦК Гаміндану ў Шанхаі, аналізуючы ноту, канстатуе, што нота закранае толькі пытаньне аб пераглядзе дагавору і зусім не закранае пытаньня аб экстатэрыяльнасьці, прыоўтнасьці амэрыканскага войска ў Кітаі, наяўнасьці ваенных нарабляў у ўнутраных водах Кітаю з тым, што гэтыя пытаньні могуць абгаварвацца толькі пасьля разьвязаньня пытаньня аб тарыфнай аўтаноміі. Газэта далей адзначае, што ў ноце два разы гаворыцца аб абароне жыцьця і маемасьці амэрыканскіх гр-н і аб зусім адноўкавых адносінах да амэрыканскіх рэзыдэнтаў. Па думцы газэты, гэта можа азначаць, што да тэй пары, пакуль іншыя краіны карыстаюцца правам экстэрытарыяльнасьці і іншымі прывілеямі, ПАЗШ таксама не адмовяцца ад іх. Газэта, аднак, пацешае сябе тым, што гэткая «інтэрпрэтацыя» парачыла-б асноўнаму тону ноты, якая пацьвярджае ўзаемную пашану і розныя правы.

„РУКІ ПРЭЧ АД КІТАЮ".

БЭРЛІН, 28-7. Адбыўся вялікі мітынг, скліканы агульна-нямецкім камітэтам т-ва „Рукі проч ад Кітаю". У аднагалосна прынятай рэзалюцыі мітынг заявіў аб рэвалюцыйнай салідарнасьці працоўных Нямеччыны з работнікамі і сялянамі Кітаю.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Пэпээсы разганяюць камуністычны мітынг.

Пасол Росяк паранены. 9 рабочых арыштавана.

ВАРШАВА, 28-VII. 27-га ліпеня ў Варшаве вечарам адбыўся антываенны мітынг, арганізаваны камуністычнай фракцыяй у сойме. На мітынгу з прамовай выступіў камдэпутат сойму Сыпула. Паўгадзінная прамова Сыпулы некалькі разоў перапынялася пагражаючымі выкрыкамі агентаў дэфэнзывы і пэпээсаўскіх дружыньнікаў, якія прыбылі на мітынг з дубінкамі. Калі пасьля прамовы Сыпулы на трыбуну ўзышоў наступны прамоўца, камуністычны дэпутат Росяк, агенты дэфэнзывы і пэпээсаўскія дружыньнікі накінуліся на ўдзельнікаў мітынгу і сумесна з прыбыўшым атрадам коннай паліцыі пачалі катаваць работнікаў. Камуністычны дэпутат Росяк паранены некалькімі ўдарамі дубінак. Паліцыя арыштавала 9 удзельнікаў мітынгу.

АГІТАЦЫЯ ЗА ЗЬМЕНУ КАНСТЫТУЦЫІ.

«Роботні» (№ 207) паведамляе, што паслы з [illegible]

Адведзіны віленскіх беларусаў ангельскім вучоным.

У Вільню прыяжджаў апошнімі днямі [illegible] вучоны С. Стэфэнс з [illegible]

СТАНОВІШЧА Ў ПОЛЬШЧЫ І КАМПАРТЫЯ.

Пасьля майскага перавароту ў 1926 годзе на чале дзяржавы стаў Пілсудзкі. Ён згрупаваў вакол сябе буйную буржуазею і абшарнікаў і стаў у цэнтры аб'яднаньня і арганізацыі фашызму ў Польшчы і гэтым значна павялічыў магутнасьць пануючай клясы—капіталістаў. У далейшай сваёй палітыцы Пілсудзкі імкнецца правесьці шэраг рэакцыйных ператварэньняў, якія-б далі гарантыю і магчымасьць правядзеньня тых ваенных плянаў, якія ўскладае на Польшчу сусьветны капіталізм.

Польскі фашызм зараз напружвае ўсе сілы да таго, каб зьнішчыць усе формы самастойнай клясавай арганізацыі рабочай клясы, каб ня даць магчымасьці пралетарыяту і працоўным масам прымаць які-небудзь удзел і ўплываць на грамадзкае жыцьцё, а галоўнае—забясьпечыць сабе спакойнае правядзеньне ваенных падрыхтовак для нападу на СССР, калі выйдзе загад сусьветнага капіталізму. Фашысцкі ўрад, у мэтах рэалізацыі сваіх мілітарысцкіх плянаў, зрабіў за апошнія два гады паход гвалту і тэрору ня толькі супроць нелегальнага рабочага руху, але і супроць легальнага. Ён разграміў арганізацыю Беларускай Грамады, арыштаваў іх дэпутатаў, асудзіў іх на 12 год катаргі, ён разграміў «незалежную» сялянскую партыю.

Фашызм у Польшчы ўяўляе сабе, кую небясьпеку стварае рабочы рэвалюцыйны рух, які пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі бязупынна ўзмацняецца, і які толькі адзін можа змагацца з ваеннымі авантурамі польскага фашызму.

Узмацненьне фашызму ў Польшчы садзейнічае ППС. Няма ніводнай краіны, дзе-б фашызм спатыкаў такое падтрыманьне, якое ён атрымлівае ў ППС. Гэта—агенты фашызму ў Польшчы. Яны здраджваюць забастоўкі рабочых, распраўляюцца з рабочымі дэманстрантамі. Аўладаўшы пры дапамозе ахраньнікаў прафсаюзамі, яны ўсімі спосабамі адцягваюць увагу рабочых ад палітычных пытаньняў. ППС ужывае ўсе меры да таго, каб аслабіць барацьбу рабочых мас супроць фашызму. Для гэтага яны вельмі стараюцца раз'яднаць адзіны фронт, заваяваны польскімі, украінскімі, яўрэйскімі і беларускімі працоўнымі, для барацьбы з фашызмам, за пралетарскую рэвалюцыю. Пасьля ўзмацненьня фашысцкай дыктатуры Пілсудзкага і па меры таго, як камуністычная партыя выкрывае здрадніцкую ролю ППС у вачох шырокіх рабочых мас, ППС усё больш адкрыта выступае, як абаронца польскага фашызму, на чале з Пілсудзкім, накіроўваючы шалёную атаку супроць камуністычнай партыі і паасобных яе членаў.

Аднак, ня гледзячы на ўзрастаючую здрадніцкую ролю ППС і прасьледваньні, рабочая кляса Польшчы дае адпор фашызму. Паказальнікам гэтага зьяўляюцца выбары ў сойм, дзе за рэвалюцыйны саюз рабочых і сялян, якім кіруе камуністычная партыя, пададзена 800 тысяч галасоў. Гэты факт зьяўляецца яскравым довадам таго, што камуністычная партыя ў Польшчы зьяўляецца буйным палітычным фактарам і сапраўдным правадыром рэвалюцыйных рабочых і сялян.

Адзінай сілай, здольнай змагацца з фашызм, у Польшчы зьяўляецца камуністычная партыя, сапраўдны абаронца эксплёатуемых і прыгнечаных рабоча-сялянскіх мас.

Галоўная задача камуністычнай партыі ў Польшчы— гэта барацьба за пралетарскую рэвалюцыю. Для гэтай мэты кампартыя павінна супроцьставіць блёку пануючых буржуазных клясаў, якія згрупаваліся вакол фашызму, саюз рэвалюцыйных рабочых і сялянскіх мас пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго камуністычнай партыі.

Кампартыя павінна няшчадна выкрываць імпэрыялістычныя мэты фашызму і падрыхтоўку Пілсудзкім вайны супроць СССР.

Дамогшыся буйнага ўплыву ў прамысловых цэнтрах на рабочыя масы, партыя павінна арганізацыйна ўзмацніць свой уплыў на заваяваных пазіцыях і адначасна пашырыць сетку камуністычных арганізацый ў горадзе і вёсцы. Ажыцьцёвіць гэту задачу партыя зможа толькі тады, калі яна зьнішчыць існуючыя ўнутры яе разгалоссі.

Арганізацыйнае пытаньне на II зьезьдзе.

Пасьля фактычна праведзенага „Искрой“ аднаўленьня партыі перад зьездам паўстала задача афармленьня партыі на падставе пэўных арганізацыйных прынцыпаў і фармальнага зацаваньня іх у статут. Вырашэньне гэтага пытаньня не абышлося без барацьбы. Розныя плыні зьезду імкнуліся па-рознаму правесьці гэта. На глебе рознага падыходу да гэтага пытаньня ўзьніклі буйнейшыя разгалоскі нават у самым іскраўскім напрамку зьезду. Гэтыя разгалоскі выліліся ў разгалоскі паміж Леніным і Мартавым па § 1 статуту партыі. Мартаўская рэдакцыя § 1 статуту была наступная: «Членам Расейскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі лічыцца кожны, хто прыме яе праграму, падтрымае партыю матар'яльнымі сродкамі і акажа ёй рэгулярнае асабістае садзейнічаньне пад кіраўніцтвам аднэй з яе арганізацый». Ленінскі праэкт фармуліраваў § 1 статуту наступным чынам: „Членам партыі лічыцца кожны, хто прызнае яе праграму і падтрымае партыю як матар'яльнымі сродкамі, так і асабістым удзелам у аднэй з партыйных арганізацый“. За гэтай, на першы погляд невялікай розьніцай і фармуліроўкай крыўся, аднак, розны падыход да партыі, яе ролі ў рэвалюцыі, у ацэнцы суадносін партыі і клясы. Мартаўскі праэкт тым, што ён прапанаваў лічыць членамі партыі ўсіх, хто будзе аказваць ёй толькі асабістае садзейнічаньне, ператвараў партыю з рэвалюцыйнай партыі барацьбы ў нешта расплыўчатае, нявыразнае, прытулак для розных элементаў, па сутнасьці выпадкова зьвязаных з партыяй. Для Мартава і яго прыхільнікаў кожны інтэлігент, які аказаў партыі тое або іншае асабістае садзейнічаньне, мог, ня будучы прынятым у арганізацыю, лічыцца ўсё-ж членам партыі. Аксельрод, выступаючы супроць ленінскай фармуліроўкі, так і заяўляў, кажучы, што «калі мы прымем формулу Леніна, дык выкінем за борт частку людзей, якія хоць і ня могуць быць прынятымі непасрэдна ў арганізацыю, але зьяўляюцца тым ня менш членамі партыі».

Ленін рашуча паўстаў супроць гэтага, бароначы разуменьне партыі, як баявой арганізацыі, кіруючай рэвалюцыйнай барацьбой пралетарыяту, а ня партыі пэўнага Конглёмэрату асоб, паміж сабой ня зьвязаных. Ён сьцьвярджаў, што „лепш, каб дзесяць працуючых не называлі сябе членамі партыі, чымся, каб адзін балбатун меў права і магчымасьць быць членам партыі“. Апартунізм Мартава і К° у тым і выяўляецца, што яны ператваралі партыю ў прытулак для ўсякіх апартуністычных элементаў, па сутнасьці не кантралюемых партыяй і за партыю не адказваючых, але партыю дэзарганізуючых. Мартаў быццам прадбачыў, што ён будзе партыю рэформ, а не рэвалюцыі.

Але рознасьць паміж Леніным і Мартавым па пытаньні аб характары партыі гэтым ня вычэрпвалася. Мартаў не разумеў таксама пытаньня і аб суадносінах партыі і клясы. Ён зусім нядвохсэнсова залічаў, што «чым шырэй будзе распаўсюджана назва члена партыі, тым лепш. Мы можам толькі радавацца, калі кожны стачачнік, кожны дэмакрат, адказваючы за свае ўчынкі, можа лічыць сябе членам партыі». Розьніца паміж членам партыі і членам клясы зусім зьнішчаецца, зьнішчаецца розьніца паміж арганізаваным і неарганізаваным, паміж сьвядомым і адсталым, цалкам зьнішчаецца розьніца паміж партыяй, як авангардам рабочай клясы, і клясай у цэлым.

Уладзімер Ільліч за ўсёй рашучасьцю паўстаў супроць стычнага ходу, даводзячы, што «мы (г. зн. сацыял-дэмакраты), ёсьць партыя клясы, і таму амаль уся кляса павінна дзейнічаць пад кіраўніцтвам нашай партыі, павінна далучацца да нашай партыі як мага шчыльней, але было-б манілаўшчынай і «хвасьцізмам» думаць, калі-небудзь амаль уся кляса або ўся кляса зможа пры капіталізьме падняцца да сьвядомасьці і актыўнасьці свайго перадавога атраду—сваёй сацыял-дэмакратычнай партыі».

Партыя—авангард, партыя—кіраўнік клясы,—убіваў Ленін у галаву меншавікоў. Да партыі мы павінны прад'яўляць больш узвышаныя патрабаваньні, як да клясы, інакш яна ня зможа быць кіраўніком клясы. Межы партыі павінны быць выразна акрэслены: партыя не павінна распыляцца ў клясе, але не павінна ад яе і адмаўляцца. Яна павінна быць зьвязана з ёю шэрагам прыводных раменьняў. Ленін сваім праэктам так і меркаваў будаваць партыю. Ён казаў: мы павінны „згодна ступені арганізаванасьці намогул і канспірацыйнай арганізацыі—у прыватнасьці, адрозьніваць такія, напрыклад, разрады: 1) арганізацыя рэвалюцыянэраў, 2) арганізацыі рабочых, магчыма больш шырокія і разнастайныя; я абмяжоўваюся аднэй рабочай клясай, мяркуючы, зразумела, што пэўныя элементы іншых кляс таксама ўвойдуць сюды пры вядомых умовах. Гэтыя два разрады складаюць партыю. Далей: 3) арганізацыі рабочых, далучаных да партыі; 4) арганізацыі рабочых не далучаных да партыі, але фактычна падпарадкаваных яе кантролю і кіраўніцтву; 5) неарганізаваныя элементы рабочай клясы, якія часткова таксама падпарадкоўваюцца, прынамсі, у выпадках буйных выяўленьняў клясавай барацьбы кіраўніцтву сацыял-дэмакратыі» (том У, стар. 356).

Пры гэткіх узаемаадносінах партыі і клясы, пры наяўнасьці цэнтралізаваных канспірацыйных арганізацый рэвалюцыянэраў, сувязь партыі з клясай, яе кіраўніцтва клясай не аслабне, а ўзмоцніцца; праца арганізацый, кіруемых партыяй, ня звузіцца, а зробіцца больш каштоўнай і папярыцца.

Гульня ў дэмакратызм, шырокая выбарнасьць, якую прапанавалі апартуністы, ва ўмовах царскага рэжыму была-б ня больш, як утопія, манілаўшчына. «Чым мацней,—казаў Ленін,—будуць нашы партыйныя арганізацыі, уключаючыя ў сябе сапраўдных сацыял-дэмакратаў, чым менш хісткасьці і няўстойлівасьці будзе ўнутры партыі, тым шырэй, разнастайней, каштоўней і карысьней будзе ўплыў партыі на акаляючыя яе, кіруемыя ёю элементы рабочых мас».

Але якраз такой цэнтралізаванай, добра згрупаванай партыі, абавязваючай сваіх членаў падпарадкавацца дысцыпліне, адхіляючай волю плыняў і груповак, абавязваючай частку падпарадкавацца цэламу, або пакінуць партыю, і не хацелі меншавікі. Інтэлігенцкі анархізм, гурткоўшчына, якія заўсёды і ўсюды зьяўляюцца прыхільнікамі апартунізму, не маглі пагадзіцца з такім настроем партыі.

На II-м зьезьдзе партыі па пытаньні аб арганізацыі партыі спаткаліся дзьве плыні—прыхільнікі буржуазна-інтэлігенцкага індывідуалізму з прыхільнікамі пралетарскай арганізацыі і дысцыпліны. Падтрыманыя рабочадзельцамі, бундаўцамі, цэнтрам мартаўцы атрымалі большасьць па § 1 статуту. Але гэтая перамога была нядоўгавечна: тое, што іскраўцы пакінулі зьезд, забясьпечыла перамогу ленінцам над мартаўцамі пры выбарах у цэнтральныя ўстановы партыі: ЦК, ЦА і

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Недапушчальнае зьявішча ў Калінікавіцкім с.-г. таварыстве.

Мазыр. Не спадабаўся агент па закупцы жывёлы Калінкавіцкага сельска-гаспадарчага таварыства—Голер свайму старшыні ды й годзе, так кажуць служачыя таварыства. Прычына нам невядомая. Аб гэтым лепш ведае сам старшыня Гурло.

21-га ліпеня ў адным з суседніх райёнаў павінен быў адбыцца кірмаш. Падумаў Голер і парашыў сваім розумам, што на кірмашы можна купіць быдла і тут-жа зрабіў нескладаныя вывады, што чым больш жывёлы ён купіць, тым больш прыбытку таварыству, а штату павялічыць для гэтае закупкі ня трэба. Ня так думаў старшыня Гурло. Атрымаў ён 18-га ліпеня ў Мазыры грошы, скарбніку іх ня здаў, а калі ўвечары да яго прышоў Голер за грашыма, каб паехаць на кірмаш, дык ён яму ў грашох адмовіў.

На другі дзень, вьявіўшыся ў кантору, Гурло паклікаў скарбніка да сябе ў габінэт і перадаў яму больш 1000 руб. Выпадкова ў кантору зайшоў Голер і на запытаньне, чаму Гурло яму ня даў грошай, старшыня, не задумываючыся, адказаў:

«Я ўчора жартаваў», і прапанаваў яму грошы, каб агент у гэты дзень паехаў на кірмаш, але ўжо было позна і агент не паехаў. Здаўшы грошы скарбніку, Гурло заявіў, што ў яго не хапае 140 руб., якія ён выкінуў у часе здачы грошай з кішэні і ўпэўнен, што гэтыя грошы забраў, зразумела, Голер. Праўда, у гэты час у канторы былі і іншыя людзі, праўда і тое, што Голер да стала, дзе ляжалі грошы, не падышоў, але на гэта наш старшыня не зварочвае ніякае ўвагі.

Усё гэта было-б ня так цікава, калі-б апошняя рэвізія ня выкрыла за старшынёю старога неапраўданага аванасу на суму ля 450 р. Такім чынам за старшынёю лічыцца ля 600 руб. Для Калінкавіцкага сельска-гаспадарчага таварыства сума значная. Апрача таго, такі-ж аванс прыблізна на 500 р. лічыцца за адным з прыказчыкаў.

Цікава было-б ведаць, чаму да гэтага часу рэвізійная камісія ніякіх мер ня прымала да спагнаньня спамянёных сум. Чаму Гурло жартаваў і ня даў агенту грошай, а прапанаваў іх на другі дзень, калі ехаць на кірмаш было ўжо позна, у каго засталіся «прапаўшыя» 140 р. Ці проста авансы за старшынёй, ці нешта іншае. Адпаведным органам трэба заняцца гэтай справай і сказаць сваё аўтарытэтнае слова.

Праца сярод пастухоў і батракоў.

Койданава. На Станькаўскім і Дабрынеўскім с-с. Койданаўскага р. праца сярод пастухоў і батракоў праводзіцца значная. За 3 месяцы—красавік, май і чэрвень—ахоплена 80 пастухоў і батракоў колдаговарамі. Зарплата павышана на 80—100 пр. у сярэднім у параўнаньні з даваенным часам. Дні адпачынку маюць амаль усе пастухі, здавальняюцца спэцадзежаю. Часта відаць, як пастух «шчагаляе» на полі ў непрамакаемым плашчы замест рызьзя былых часоў.

Удзельнічаюць пастухі і батракі ў сябры саюзу с.-г. і л. р. клясавая самасьвядомасьць сярод батрацтва значна ўзрасла. Але шмат яшчэ трэба папрацаваць па ўцягненьні батрацтва вёскі ў кіруючыя вясковыя ўстановы.

Мацней трэба ўзяць напрамак на ўзьняцьце актыўнасьці батракоў, даручаючы ім розныя грамадзкія працы.

А. З.

Патрэбна папраўка.

Рагачэў. У мінулым годзе сялянству давалася вельмі і вельмі нязначная скідка з сельска-гаспадарчага падатку за вымачкі. Так, напр., селянін Курганскага сельсавету, Рагачэўскага раёну, хутара Рыскова Тамаш Марчанкаў атрымаў скідкі 28 кап. тады, як большая палова яго пасеваў як азімых, так і яравых, вымакла. 28 кап. складалі ў Марчанкава палову сумы чацьвертага тэрміну выплаты сельска-гаспадарчага падатку. Вядомая рэч, што 28 кап. нішто ў параўнаньні са згінуўшым насеньнем у Марчанкава, а аб ураджаі і гаварыць ня прыходзіцца. Дзяржаўным падатковым органам неабходна своячасова і стала распрацаваць пытаньне аб скідках з сельска-гаспадарчага падатку за вымачкі. Неабходна пры дачы скідак прымаць пад увагу плошчы вымачкі, плошчу перасеваў, плошчу пашні, быўшую пад вадою ў часы сяўбы, а не наогул падыходзіць з аднэй меркай да ўсіх вымачак, якую-б плошчу яны ні займалі ў аддзельнасьці ў кожнага гаспадара.

А. Ісакаў.

Пасеў і ўборка.

Па Койданаўскаму і Самахвалавіцкаму раёнах, ня гледзячы на дрэнную вясну, стан яравых у ліпені значна палепшыўся. Ячмень лепшы, чым у мінулым годзе. Аўсы таксама лепшыя. Бульба ідзе пакуль што так, як у мінулым годзе. Жыта налілося добра. Наогул, можна чакаць у гэтым годзе добрага ўраджаю як азімых, так і ярыны. Толькі грэчка і канюшына горшая, чым у мінулым годзе. Сэрадзіна і карняплоды маюць здавальняючы выгляд.

Для ўборкі сена стаіць добрая пагода і ўборка ідзе поўным тэмпам. Жніво жыта і ячменю пачнецца не раней 8-га жніўня.

З прычыны позьняй уборкі жыта, пасеў асеньні будзе спозьнены.

А. З.

Меншчына.

50.000 руб. на камунальнае будаўніцтва гораду.

Магілеў, 30-7. Акрвыканком узьняў хадайніцтва перад Белкамунбанкам аб водпуску 50.000 рублёў доўгатэрміновага крэдыту на камунальнае будаўніцтва гораду.

Растраты ў каапэрацыі.

У Барысаўскім ЦРК.

Барысаў. Загадчык сталоўкі пры заводзе «Чырвоная Бярэзіна» Палеяс растраціў 765 руб. Загадчык 2 сталоўкі ў Нова-Барысаве Нікіфараў сумесна з буфэтчыкам Сырамятнікавым растрацілі 1800 руб. Акрамя таго Сырамятнікаў злачынна адносіўся да пакупцоў. Злачынцы вынятыя з працы, вядзецца сьледзтва.

Растрата ў 4000 руб.

Капаткевічы, 30-7. Старшыня Капаткевіцкага спажывецкага т-ва тав. Аляксеў рэстраціў звыш 4000 руб. і сам скрыўся. Справа аб растраце перададзена пракурору акругі.

Як прасоўваюць кнігу ў масы.

Пятрыкоў. Паслаў Пятрыкоўскі спажывецкі каапэратыў на кніжныя курсы хлапца, каб мець больш падрыхтаванага працаўніка ў кніжнай краме.

Пасхаў гэта хлапец на курсы і скончыў. Атрымаў зарадку і прыехаў з пастановай ЦК КП(б)Б і Белкаапсаюзу, што ў сувязі з культурнай рэвалюцыяй усім трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на гандаль кніжкамі, асабліва каапэратывам.

Што-ж мы бачым? А тое, што ў кніжнай краме падбор кніжок зусім не адпавядае патрэбам спажыўца, ды к гэтаму на большасьці паліц—хоць шаром пакаці, і, ня гледзячы на гэта, ужо два месяцы ня выпісвалі ніякіх кніжак. Прыказчык-жа гэтай крамы, як быццам хоча паказаць спажыўцу, што ён ня прыказчык, а стораж, бо калі нікога ў краме няма, дык дрэмле. Прыходзіць-жа пакупец—бярэцца за падмятаньне крамы. Зьвернуцца да яго: «Дайце мне»... Адказ з перабоем —«Видите, я занята». А курсант, хлапец трохі з адукацыяй і паставіў-бы справу надобра, а ходзіць бяз дзела. Каб пахадзіла чысьцілка па каму трэба ў нашым каапэратыве, мо так і ня было-б.

Трубка.

За правільны вучот аб'ектаў!

Чавусы, 30-VII. Прэзыдыум райвыканкому прапанаваў упаўнаважаным, прымацаваным да сельсаветаў, тэрмінова выехаць у сельсаветы для праверкі вучоту аб'ектаў абкладаньня і і выяўленьня захаваных аб'ектаў.

Старшыні райвыканкому даручана правесьці нараду ўпаўнаважаных. Халмоўскай сельскай вучотнай камісіі за нядбайнасьць (ня выяўлена каля 400 дзесяцін зямлі ў аднэй толькі вёсцы Васьхавічах) вынесена суровае вымаўленьне, з абвяшчэньнем у друку.

Кантрактацыя сьвіней.

Гомель, 30-7. Палессельсаюз і Белсельтрэст распачалі працу па кантрактацыі на Гомельшчыне 1500 сьвіней ангельскага гатунку. Гэта робіцца дзеля таго, каб палепшыць гатунні [illegible]

Жніво пачалося.

Мазыр, 29-7. Пачалося жніво па Мазырскай акрузе. Пагода спрыяе жніву.

13.000 руб. на кантрактацыю цялят.

Бабруйск, 30-7. Акруговы вяжельны аддзел адпусьціў 13.000 руб. на кантрактацыю цялят. Ужо закантрактавана 100 цялят, якія будуць разьмеркаваны па сялянскіх гаспадарках акругі.

Мэта кантрактацыі цялят—палепшыць жывёлаводзтва ў акрузе.

Куды ідуць адлічэньні ад рэалізацыі пазыкі.

Капыль, 30-7. У бліжэйшыя дні распачнецца грунтоўны рамонт мясцовай амбуляторыі. На гэту мэту асыг[illegible] на 1500 руб. з адлічэньняў у мя[illegible]ходзіт ад рэалізацыі пазыкі [illegible] сялянскай гаспадаркі.

[illegible] 30-7. З 10 проц. адлі[illegible]ю па райёну [illegible] пазыкі, адпу[illegible]капітальны рамонт

[illegible]арэла.

[illegible]шыне ў боль[illegible] за хворы[illegible]орым на ру[illegible]прыме. Дзя[illegible] ад больні[illegible]йённых пра[illegible]ды. Жы[illegible]цу, і гэт[illegible]

[illegible]нкце.

[illegible]ння ча[illegible]пунктам [illegible]ьмерка[illegible]авана [illegible]іх— [illegible]орна[illegible] [illegible] час [illegible]очых і [illegible]ме-

2-я ПАЗЫКА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ ПРА ПАЗЫКУ.

Колькі выпушчаецца аблігацый і па якой цане.

Новая пазыка падзяляецца на два выпускі—па 250.000.000 руб. кожная. Адзін выпуск пазыкі зьяўляецца процантна-выгрышным, г. зн. крыбытак па аблігацыях гэтага выпуску выплачваецца ў выглядзе процантаў па купонах і часткаю ў выглядзе выйгрышаў.

Другі выпуск зьяўляецца бяспроцантна-выгрышным, г. зн. па гэтаму выпуску прыбытак выплачваецца толькі ў выглядзе выйгрышаў.

Усяго па двох выпусках пазыкі будзе выпушчана ў продаж 20.000.000 аблігацый.

Кожная аблігацыя каштуе 25 р., прычым кожная аблігацыя падзяляецца на пяць частак коштам у 5 руб.

Такім чынам, хто ня мае грошай купіць поўную аблігацыю, той заўсёды можа набыць адну або больш частак аблігацыі.

Якая сума грошай адпускаецца на выйгрышы і аплату купонаў.

Другая пазыка індустрыялізацыі выпушчаецца на 10 гадоў. За гэты тэрмін па двух выпусках будзе праведзена 76 тыражоў, у якіх будзе разыграна 2.921.500 выйгрышаў, на суму 311.535.000 руб.

Найбольшы выйгрыш па новай пазыцы вызначан у суме 5.000 руб., пасьля—у 1.000 руб., у 250 і 100 р. Процантаў па купонах за ўвесь час пазыкі будзе выплачана 119.589.375 р.

Такім чынам, урад па новай пазыцы ў працягу дзесяці гадоў выдасьць на аплату купонаў і выйгрышаў 431.124.375 руб.

Ільготны продаж пазыкі

Для рабочых і служачых пазыка будзе прадавацца пры калектыўнай падпісцы ў растэрміноўку на 8 месяцаў, а пры падпісцы паасобных пакупцоў—на 4 месяцы. Рабочыя і служачыя калектыўную падпіску могуць правесьці па месцу працы, а сяляне —праз сялянскія камітэты ўзаемадапамогі, каапэратывы, камуны, калгасы і г. д.

Пазыка будзе распаўсюджвацца добраахвотна. Спосабы прымусовага разьмяшчэньня, якія ўжываліся ў некаторых райёнах пры продажу сялянскай пазыкі, ні ў якім выпадку дапушчаны ня будуць.

Аблігацыі пазыкі будуць распаўсюджвацца ўсімі банкамі, ашчаднымі касамі, сельска-гаспадарчымі крэдытнымі таварыствамі, прафсаюзнымі і іншымі грамадзкімі арганізацыямі.

Афіцыйна продаж пазыкі пачнецца 1 верасьня 1928 году.

Шансы на выйгрыш.

Па процантна-выйгрышнаму выпуску колькасьць выйгрышаў у першых 24 тыражох выйгрышаў складзе 29.000 у кожным. На першы тыраж у звароце будзе 10.000.000 нумароў аблігацый. Такім чынам, адзін выйгрыш у першым тыражы прыпадзе ў сярэднім на 344 аблігацыі (10.000.000:29.000).

Такім чынам, выйграўшая аблігацыя пагашаецца і ў далейшых тыражох выйгрышаў ня прымае ўдзелу, а колькасьць выйгрышаў у першых 24 тыражох застаецца нязьменнай, дык в кожным тыражом магчымасьць выйгрышу павялічваецца. У апошні, 38, тыраж адзін выйгрыш прыпадае на 164 аблігацыі.

Па бяспроцантна-выйгрышнаму выпуску магчымасьць выйгрышу яшчэ большая. У гэтым выпуску выйгрышаў у першых 24-х тыражох месяца 61.000 у кожным. На першы тыраж у звароце будзе 10.000.000 нумароў аблігацый. Такім чынам, шанс на выйгрыш у першым тыражы складзе —163 аблігацыі на адзін выйгрыш (10.000.000:61.000).

У апошнім, 38-м, тыражы 1 выйгрыш прыпадзе толькі на 76 аблігацый.

ЯК БУДЗЕ РАСПАЎСЮДЖВАЦЦА ПАЗЫКА Ў ВЁСЦЫ.

У адзнаку ад ранейшых пазык, другая пазыка індустрыялізацыі будзе разьмяшчацца наступным парадкам.

Раней усяго пры калектыўнай падпісцы ўводзіцца растэрмінаваньне выплат за аблігацыі на 8 месяцаў. Гэтай растэрміноўкай у вёсцы могуць скарыстацца ўсе сяляне, аб'яднаныя ў каапэратывы ўсіх відаў—у камуны, савгасы, арцелі, машынныя таварыствы, спажывецкія каапэратывы і г. д.

Праўленьні ўсіх такіх аб'яднаньняў будуць прымаць падпіску, зьбіраць грошы і здаваць іх сельсавету.

Падпіска на пазыку пачнецца з 1-га верасьня, а першы ўзнос за аблігацыі трэба ўнесьці к 1 лістападзе.

Для аднаасобных пакупцоў упяршыню дакрэтам аб новай пазыцы ўстанаўляецца 3-хмесячная растэрміноўка плацяжоў. Першы ўзнос таксама трэба ўнесьці к 1 лістападу.

Пры пакупцы аблігацый за налічны разрахунак даецца скідка ў 50 кап. з 25 руб. аблігацыі.

Цэнтрам, яднаючым і кіруючым усёй працай па разьмяшчэньні пазыкі ў райёне ці сельсавеце, будзе РВК і сельсавет. Сельсавет мае права прыцягваць да працы па разьмяшчэньні пазыкі ўсе арганізацыі і ўстановы вёскі і паасобных актыўных працаўнікоў: хатнікаў, дактароў, настаўнікоў, сялян-перадавікоў і г. д.

Аднаасобныя агенты, а таксама ўстановы і арганізацыі, прыцягнутыя РВК і сельсаветамі к распаўсюджванню пазыкі, за сваю працу будуць атрымоўваць узнагароду ў разьмеры 1,5 проц. з распаўсюджанай сумы. Сельсавет з праданых ім непасрэдна аблігацый будзе атрымоўваць 1,5 проц. і 0,25 проц. з сумы выручанай яго агентамі. РВК атрымоўваюць 0,25 пр. з ўсёй сумы, атрыманай за праданыя аблігацыі.

Мясцовыя бюджэты атрымоўваюць з выручанай ад продажы аблігацый сумы 10 проц. РВК і сельсаветы могуць атрымоўваць гэтыя адлічэньні для здаволеньня сваіх неадкладных патрэб непасрэдна пры самой здачы грошай у фінансавыя органы.

ЗА ПАДНЯЦЬЦЕ УРАДЖАЙНАСЬЦІ Ў БССР.

Беларусь мае больш інтэнсыўную гаспадарку, як іншыя сельска-гаспадарчыя райёны СССР. Ня гледзячы на гэта, сярэдні беларускі ўраджай ніжэй, як ураджай чорназёмнай паласы Саюзу і толькі нязначна вышэй за ўраджай нечарназёмнай паласы. Быццам вялікая інтэнсыўнасьць сельскай гаспадаркі не адбіваецца на абсалютнай вышыні ўраджаю.

Рух ураджайнасьці пераконвае ў адваротным. Улюбённая тэма расейскіх статыстыкаў аб руху ўраджайнасьці дастаткова распрацавана і мае цэлы шэраг асобных, моцна ўстаноўленых, эмпірычных закономернасьцяй.

У сытэме абагульваючых палажэньняў, напярэдадні ўвядзеньня якіх стаіць праца савецкіх статыстыкаў-матэматыкаў і эканамістаў, бясспрэчным палажэньнем будзе: **чым вышэй інтэнсыўнасьць сельскай гаспадаркі таго ці іншага райёну, тым устойлівей ураджайнасьць, тым пэўней падняцьце ўраджаю з году ў год, тым незалежней рух ураджайнасьці ад мэтэоролёгічных умоў.**

Гэта становішча пацьвярджаецца ўжо тым фактам, што ўсе паказальнікі ідуць у напрамку нарастаньня інтэнсыўнасьці—у асноўным з усходу на захад. І найбольш заходні з райёнаў СССР—Беларусь—мае найбольш устойлівы ўраджай, які падпадае найменшым гадавым хістаньням, найбольш незалежны ад кліматычных уплываў.

І ўсё-ж, ня гледзячы на такі характар паступальнага руху, тэмп нарастаньня ўраджайнасьці ў Беларусі вельмі марудны; лічбы ўраджайнасьці за 47 гадоў па жыту, аўсу і ячменю даюць хоць і нясупынны, але надзвычайна слабы ўздым.

І марудны тэмп росту беларускага ўраджаю і яго нізкі ўзровень, у параўнаньні з сярэднім саюзным ураджаем, тлумачыцца некалькімі прычынамі. Папершае, горшымі прыроднымі умовамі Беларусі; кліматычныя ўмовы тут лепшыя, але глебавыя ўмовы значна горшыя, як у РСФСР і на Украіне. **Разрыў між узроўнем інтэнсыўнасьці сельскай гаспадаркі і ўзроўнем ураджаю можна тлумачыць толькі пры дапушчэньні нізкай «эканамічнай» ацэнкі прыроды Беларусі.**

Другой і галоўнай прычынай зьяўляюцца ўмовы грамадзкія—з іх фокуснай умовай трэба лічыць—**глыбокую натуральнасьць сельскай гаспадаркі Беларусі.**

Бліжэйшай прычынай натуральнасьці беларускай сельскай гаспадаркі трэба лічыць яе выключную раздробленасьць і неадпаведнасьць надворнага асяродку **тыпу** сельскай гаспадаркі БССР.

Тып сельскай гаспадаркі БССР можна ахарактарызаваць, як **жывёлаводчы мяса-інтэнсыўны, з прамыслова-тэхнічным паляводзтвам.** Адпаведнасьць гэтага тыпу сельскай гаспадаркі надворнаму асяродку была-б: пры наяўнасьці густой чыгуначнай і шасэйнай сеткі і пры прыстасавальні транспарту да перавозак прадуктаў інтэнсыўнай сельскай гаспадаркі (халадзільнікі, вагоны-ледніцы і г. д.), або пры немагчымасьці мець ёмкія рынкі выгаднага збыту па-за межамі рэспублікі і пры неарганізаванасьці сувязі з імі—адпаведнасьць была-б дасягнута: або пры высокім разьвіцьці мясцовых рынкаў і дастатковай урбанізацыі краіны або пры высока-пастаўленай сельска-гаспадарчай індустрыі. Ня ўсе гэтыя ўмовы маюцца.

Чыгуначная сетка БССР недастатковая, пад'язныя шляхі амаль адсутнічаюць, халадзільнае будаўніцтва толькі пачалося, ні экспарт заграніцу, ні сувязь з ленінградзкім, маскоўскім і украінскім прамысловым рынкам як сьлед не наладжаны. Гарадзкое насяленьне нязначнае (817,6 тыс., ці 16,4 проц.), буйныя індустрыяльныя цэнтры толькі пачынаюць разьвівацца, няма мясцовых беларускіх рынкаў для збыту сьвежамалочнай і сьвежамясной прадукцыі.

Раздробленасьць беларускай сялянскай гаспадаркі без сапраўды рэальнай і шырокай мэліярацыі і без калектывізацыі ня можа быць зьнішчана. Мэліярацыя ўжо шырока разгортваецца калектывізацыя робіць значныя посьпехі, але тэмп і таго і іншага далёка адстае ад тэмпу драбленьня гаспадарак і ад тэмпу землеўпарадкаваньня. Землеўпарадкаваньне мае землямерны, а не агранамічны характар. Агранамічная сетка ў БССР маладая.

Падняцьце ўраджайнасьці ў Беларусі будзе ісьці па меры зьнішчэньня затрымліваючых інтэнсіфікацыю сельскай гаспадаркі БССР прычын. Сама пастаноўка пытаньня аб падняцьці ўраджайнасьці бяз сувязі з інтэнсіфікацыяй і падняцьцем вытворчасьці ўсёй сельскай гаспадаркі (у тым ліку ня менш важнага для БССР за расьлінаводзтва—жывёлаводзтва)—мне здаецца ня зусім удалай. Такая пастаноўка адаб'ецца на агра-тэхнічных мерапрыёмствах.

Да павялічэньня вытворчасьці ўсёй сельскай гаспадаркі Беларусі павядуць:

а) **павялічэньне рыначнасьці сельскай гаспадаркі БССР і б) ужываньне тых тэхнічных мерапрыёмстваў, якія накіраваны да „палепшаньня“ глебы Беларусі.**

Асобнымі мерапрыёмствамі на гэтым шляху будуць:

1) Інтэнсыўнае будаўніцтва чыгунак і шосаў, іх найбольш «эфэктыўнае» разьмяшчэньне па тэрыторыі БССР; халадзільнае будаўніцтва—«аўладаньне» не беларускім рынкам.

2) Індустрыялізацыя БССР. Стварэньне ёмкага ўнутранага рынку.

3) Максымальнае разьвіцьцё сельска-гаспадарчай прамысловасьці.

4) Мэліярацыя балот. Узмацненьне яе тэмпу.

5) Калектывізацыя сельскай гаспадаркі, каапэрацыя.

6) „Агранамізацыя“ землеўпарадкаваньня, самой агранаміі і сялянства.

7) Мінэральныя ўгнаеньні, сідэрацыя—як цэнтральныя «тэхнічныя» праблемы.

8) Племянная і насеннаводчая справа.

Г. ГАРЭЦКІ.

Жыцьцё і праца асьветніка.

Антырэлігійнасьць і настаўнік.

Антырэлігійная прапаганда паслабела. Рэлігійная прапаганда ўзмацняецца. Папы розных колераў меняюць сваю надворную ахварбоўку, прыстасоўваюцца да акалічных умоў, вядуць барацьбу за сваё існаваньне, прыцягваюць на свой бок усе антысавецкія элементы. Сэктанты знаходзяць прытулак па вёсках і разам з папамі робяць уплыў на вясковую моладзь.

Пад папоўскімі рызамі, манашаскімі клобукамі, архірэйскімі мітрамі, пад кратамі і кадзіламі ў «сьвятых престолов» хаваюцца ворагі савецкай улады, працоўных. Яны ўпарта вядуць клясавую барацьбу.

Гэтай чорнай сіле неабходна паставіць супроць другую сілу.

Сілы гэтай ёсьць шмат. Трэба толькі неравесьці яе з становішча патэнцыяльнай у кінэтычную. За гэта ўпяршыню павінна ўзяцца кампартыя, ускалыхнуць партыйныя ячэйкі і гэтымі хвалямі абхапіць мясцовы беспартыйны актыў, у тым ліку і настаўніцтва вёскі.

Школа на вёсцы зьяўляецца тым асяродкам, адкуль можа і павінна найсьці барацьба з рэлігійным дурманам. Гэтаму вельмі спрыяюць умовы. Праграмны матар'ял дае магчымасьць на кожным кроку высунуць навукова-марксысцкі падыход да розных зьяў як жыцьця прыроды, так і жыцьця грамады.

Той матар'ял (вучні), які апрацоўвае школа, зьяўляецца мяккім. На яго вёска рабіць уплыў, вучні вельмі цікавяцца рознымі зьявамі. Настаўніку толькі застаецца правільна тлумачыць іх.

Вясковая школа жыве на сцэне барацьбы новага і старога побыту вёскі. Тут кожны бытавы выпадак магчыма скарыстаць сьвежым, даць яму належнае тлумачэньне і гэтым зрабіць уплыў на тую частку насельніцтва вёскі, асабліва моладзь, якая школай не ахоплена.

Але каб выкарыстаць кожны выпадак з мэтай антырэлігійнай барацьбы, настаўніцтва павінна мець гэта заўсёды на ўвазе, павінна быць падрыхтавана да вядзеньня антырэлігійнай працы.

Ці добра стаіць гэта справа сярод настаўніцтва? На гэта пытаньне агульнага адказу не далі. Частка настаўніцтва да гэтага падрыхтавана. У пэдтэхнікумах пытаньне антырэлігійнай барацьбы павінна стаяць добра, вядома, не бяз выключэньня.

На вёсцы працуе частка настаўніцтва, якая атрымала адукацыю пры царскай уладзе. А тады можна было казаць толькі аб рэлігійнай прапагандзе. Жыцьцё гэтую рэлігійнасьць з настаўніцтва зганяла. А ці зрабілася настаўніцтва антырэлігійным? [illegible] гэтага сказаць нельга.

[illegible] нерэлігійнага, ёсьць [illegible]лігійнага. Вось таму прыклад: настаўнік Т. хоць ноччу, але сваё дзіця ахрысьціў.

Прыходзяць пасьля гэтага вучні яго да другога настаўніка і пытаюць, чаму гэта настаўнік кажа нам, што бога няма, а сам дзіця хрысьціць.

Настаўніца Х.—штатная кума на ўсіх хрэсьбінах і пастаянны госьць на вясельлях.

Настаўнік Г. жэніцца на шляхцянцы. Трэба браць шлюб у касьцёле. Страшна, каб пасьля гэтага з пасады не пагналі. І вось ён увечары цішком ідзе ў касьцёл праз тыя дзьверы, куда ніхто ня ходзіць, акрамя ксяндза, а маладуха праз агульныя. Аб гэтым было ўжо ў друку («Чырвоная Полаччына»).

Настаўнік у гасьцёх у папа. Абодвы напіліся. У п'яным угары падымаюць чаркі, пяюць Інтэрнацыянал і крычаць: «Няхай жыве савецкая ўлада на чале з Троцкім і Зіноўевым».

В. раймясцком саюзу Працасьветы адчыняе адно з сваіх пасяджэньняў на кватэры настаўніка пры асьвятленьні «сьвятых лампадак».

Ці ня досыць прыкладаў? Гэта толькі па Полаччыне. Але ня ўсё.

Чаго магчыма чакаць ад такога настаўніка? Кім ён зьяўляецца пры дыктатуры пралетарыяту? Гэта прыхільнікі, толькі не пралетарыяту, не савецкай улады і ВКП.

Як-жа быць? Што рабіць?

Востра паставіць перад усім настаўніцтвам пытаньне антырэлігійнай прапаганды, паставіць гэта пытаньне тая, каб яно ня было падобна на розныя кампаніі. Антырэлігійнае пытаньне павінна прасякаць усю працу, усё жыцьцё настаўніцтва. Кожны крок жыцьця настаўніку неабходна помніць, што ён антырэлігійнік.

Рэлігійны настаўнік—дрэнны настаўнік. Ён ня можа запаліць агнём ненавісьці ні дзяцей, ні моладзь, ні дарослае насельніцтва,—ненавісьці к рэлігійнаму дурману, к таму, хто гэтаму дурману служыць, яго распаўсюджвае.

Як выключэньне, ёсьць частка настаўніцтва і рэлігійнае.

Пра гэту частку трэба сказаць, што яе неабходна з складу настаўніцтва выключыць.

Ці не пара паставіць пытаньне аб выключэньні з статуту саюзу працаўнікоў асьветы і таго артыкулу, які дазваляе прымаць у саюз членаў бяз розьніцы рэлігійных перакананьняў?

Як мерапрыёмствы к уздыму антырэлігійных пытаньняў неабходна: паставіць гэту справу на належную вышыню ў пэдтэхнікумах.

Партыйным і прафэсыйным арганізацыям неабходна пачаць працу па антырэлігійнаму выхаваньню працуючага настаўніцтва шляхам набыцьця ў бібліятэкі мясцковай антырэлігійнай літаратуры.

Пастаноўкай на райканфэрэнцыях дакладаў на антырэлігійныя тэмы.

Пастаноўкай гэтага пытаньня на курсах перападрыхтоўкі настаўніцтва ў летні час.

Удзяцьненьнем настаўніцтва ў гурткі бязбожнікаў.

Настаўнік.

Каб ня было зрываў.

Часамі школы складаюць добрыя пляны (навучыліся ўжо). Прадугледжана ўсё: і вучэбная справа, і выхаваўчая, і грамадзкая праца і г. д.

Але правесьці плян у жыцьцё рэдка ўдаецца. І не настаўнікі ў гэтым вінаваты.—Перашкаджаюць непрадбачаныя нікім зрывы ў выкананьні плянавай працы. Зважылі, скажам, настаўнікі пляны сваёй працы, на кожны дзень тэмы і заданьні намецілі і працуюць па гэтых плянах тыдзень-другі, а тут неспадзеўкі якая-небудзь канфэрэнцыя. Складай плян занава. Намечана насяджэньне школьнае рады, усе настаўнікі адпаведным чынам разьмеркавалі свой час і працу, а тут—нарада загадчыкаў, і зноў перабудоўвай пляны. А тут нечаканыя агульныя саюзныя сходы...

І вось настаўнікі і школы ніяк ня могуць плянава наладзіць і праводзіць працу. Пастаянныя зрывы. А гэта шкадліва адбіваецца і на выхаваньні вучняў, бо выхаваўчая праца патрабуе пэўнага рэжыму часу, сталага раскладу ў заняткох і цьвёрдага яго правядзеньня ў жыцьцё.

І такое зьявішча наглядаецца ўсюды: у гарадзкіх і райённых сямёхгодках, у масавых школах.

У чым тут справа? Справа ў тым, што ў складаньні плянаў няма ніякай узгодненасьці. Мясцком працасьветы складае свае пляны сам па сабе, інспэктар таксама, школы складаюць свае пляны самастойна і г. д. І ўрэшце ўсе адзін аднаму перашкаджаюць, зрываюць працу.

Неабходна дагаворанасьць з самага пачатку году. Пляны працы інспэктара і мясцкому павінны быць узгоднены зараней і вядомы школам, каб апошнія свае пляны будавалі, прымаючы пад увагу агульны плян працы школ у райёне. Зусім зразумела, што ўсякія кампаніі, сходы, канфэрэнцыі, сьвяты і г. д. павінны быць зараней улічаны і прыняты пад увагу.

Працы школ неабходна прыдаць плянавы характар працы. Гэтыя пляны павінны быць увязаны з мясцовымі плянамі савецкіх органаў і саюзных арганізацый.

Асьветнік.

Пазвонім па тэлефону.

(Рагачэўскі РВК., Бабр. акругі).

Шмат ужо было допісаў у друку аб несваечасовай выплаце пэнсіі настаўнікам. Але допісы допісамі, а грошы так і ня выплачваюцца своечасова. Як відаць, установы, якія ведаюць грашыма, глядзяць на допісы з пляваньнем. Узяць, напр., Рагачэўскі РВК. Замест таго, каб выплаціць пэнсію настаўнікам уперад за час адпачынку, дык яшчэ не клапоціцца выплачваць штомесячна, своечасова 20 числа згодна дагавору.

Зьяўляліся за грашыма ў РВК числа 12 ліпеня, там сказалі няма грошай, ма быць к 1-му жніўня будуць—выдадзім, а нарэшце чакайце, мы вам пазвонім, як будуць грошы.

Цікава запытацца, калі гэта РВК зьбярэцца званіць па тэлефону наконт выплаты пэнсіі настаўнікам, ці ня 1-га верасьня, калі прыдзецца распачынчаць заняткі ў школах.

Саюз працасьветы—дзе ты?

Настаўнік.

Да райённых настаўніцкіх курсаў-канфэрэнцый.

Набліжаецца новы навучальны год, і райённыя курсы-канфэрэнцыі павінны даць моцную зарадку настаўніцтву на ўзьняцьце вытворчасьці школ і поўны напрамак на зьнішчэньне ўсіх недахопаў і недарэчнасьцяй у працы школ, якія былі зазначаны на заключных канфэрэнцыях пасьля навучальнага году.

Я хачу спыніцца і выпяціць балючае пытаньне аб магчымасьцях комплекснага выкладаньня ў аднакамплектавай школе, якое ня мае прынцыповага вырашэньня і займае ўвагу і акруговых курсаў па перападрыхтоўцы, і кожнага настаўніка.

Думка аб немагчымасьці ўжываньня комплекснасьці ў аднакамплектавай школе пярэчыць сутнасьці і задачам яе, і гэтае пытаньне патрабуе чагосьці канкрэтнага ў яго вырашэньні.

Астаткі запужанасьці цяжкасьцямі комплекснага выкладаньня, недасканалае знаёмства з праграмамі і пытаньне плянаваньня навучальнага матар'ялу, складаньне вытворчых і рабочых плянаў, вось, па-мойму, галоўныя перашкоды і моманты, якія абвастраюць гэта пытаньне.

Бязумоўна, і аб'ектыўныя ўмовы працы школ, як недахоп матар'ялаў, дапаможнікаў, належнага абсталяваньня, падручнікаў і інш. зьяўляюцца занадта сур'ёзнымі перашкодамі, але гэтыя перашкоды зьнішчаюцца разам з гаспадарчым умацаваньнем, а зьнішчэньне суб'ектыўных перашкод павінна стаць задачай сёньняшняга дня.

Сталае абгаварэньне ўсіх вызначаных момантаў у час падрыхтоўкі да навучальнага году, выпрацоўка адзінага прынцыпу плянаваньня навучальнага матар'яду і складаньне рабочых плянаў, асабліва для школ аднакамплектавых, сталае вывучэньне праграм і іх спрашчэньне ў бок скарачэньня з боку мэтадалёгічнага камітэту значна палегчыць працу настаўніка і прасуне ўперад справу комплексаў наогул у школе і асабліва аднакамплектавай.

Чавусы. **А. Прохараў.**

НАПЯРЭДАДНІ НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ.

Ужо заканчваецца пабудова 2-хпавярховага будынку для Ляхаўскай сямёхгодкі, у якім будзе з наступнага навучальнага году размешчана беларуская сямёхгодка.

Зроблена прыбудова для 26-ай сямёхгодкі. У гэтай прыбудове будзе размешчаны 2 клясныя пакоі і кватэра загадчыку.

На рамонт школ гораду Менску адпушчана толькі 15.000 руб., але і за гэтыя гроші кожная школа правядзе тыя ці іншыя невялікія рамонты і сустрэне новы навучальны год падрыхтаваны. Адрамантавана ў школах і часткова папоўнена клясная мэбля.

Сетка школ з наступнага году павялічваецца згодна плану на 1 кампл. першага канцэнтру і на 4—другога.

У наступным годзе мяркуецца зьвярнуць асаблівую ўвагу на падняцьце якасьці школьнай працы як у галіне вучэбнай, так і выхаваўчай. У вучэбнай частцы будзе зьвернута ўвага на набыцьцё фармальных ведаў і ў выхаваўчай—на чоткае правядзеньне клясавай лініі, антырэлігійнае і інтэрнацыянальнае выхаваньне. Пашырана таксама будзе грамадзка-карысная праца школы і работа з бацькамі вучняў на пытаньнях выхаваўчай працы.

Пляны працы на наступны год былі ўжо абгавораны ў свой час на нарадзе загадчыкаў школ гораду і ў гэтым напрамку школы таксама сустракаюць новы год падрыхтаванымі.

Мяркуецца на прыкладу мінулага году наладзіць у школах дапамогу дзецям бедноты як шляхам забясьпечаньня падручнікамі і сшыткамі, а таксама аказваць некаторую дапамогу і вопраткай. Да гэтай працы мяркуецца прыцягнуць, як і летась, нашу грамадзкасьць.

Будзе таксама, як і раней, наладжана дапамога адстаючым вучням, каб не павысіць процант другагоднікаў.

Усеагульнае навучаньне сёлета ахопіць дзяцей 8 і 9-гадовага ўзросту, і калі летась пазашколай па розных прычынах засталося 113 дзяцей 8-мі гадовага ўзросту, дык сёлета ўсе васьмёхгодкі і дзевяцёхгодкі будуць ахоплены школай.

У заключэньне неабходна сказаць, што першым канцэнтрам сёлета будзе ахоплена ўжо 96 проц. дзяцей адпаведнага ўзросту, а другім—90 проц.

НА БАЛОЦЕ ЗАБУРЛІЛА ЖЫЦЬЦЕ.

(Ад спэцыяльнага карэспандэнта з Асінастрою).

Паказалася жыцьцё.

Ворша, а ад яе шаса на Віцебск. Гэтая шаса нічым не адрозьніваецца ад іншых: вузкая стужка цягнецца далёка наперад, перасякаючы ўзгоркі, балоты, ляскі і хмызьняк. На кожным кроку новы краявід; з-за кожнага ўзгорку выглядае новы малюнак.

На гэтай шасе, у 10 кілёмэтрах ад Воршы, у балотных хмызьнякох прытуліліся вёска Грышаны. Цяпер гэта вёска зрабілася цэнтрам, праз які часта з рогатам пралятаюць аўтамабілі і матацыклеткі. Ад Грышан у густы балотны імшарнік стужкай працягнулася шаса да Асінастрою.

Едучы куды-небудзь, мясцовыя сяляне ня ломяць ужо колаў па выбоістай, карчыстай і мокрай балотнай дарозе.

Сярод карлікавых сасонак, што расыпаліся па мохавым балоце, паказалася жыцьцё.

Ад Грышан простаю шосаю прыяжджаеш у

новы горад.

Цемнату ночы і акаляючага лесу прабіваюць сотні электрычных лямпачак. Пад'ехаўшы бліжэй, можна пачуць выразны, манатонны грукат часовай электрастанцыі.

Агні робяцца выразьнейшыя і колькасьць іх павялічаецца. Выехаўшы з лесу на паляну, відаць асьветленыя контуры вялікіх, невясковых дамоў.

Цэлыя групы, парачкі і адзіночкі стукаюць абсадамі па драўляных асьветленых тратуарах.

Толькі што ў гэты новы балотнаясны горад прыбыў цягнік і праразьлівым сьвістам спужаў жыхароў глухога балотнага лесу—філіпаў і соваў. Праз некалькі хвілін па рэйках загрукала аўта-дрэзіна. З лесу паказалася цэлая партыя рабочых-землякопаў.

Змыўшы з цела потны пыл, які абліпіў яго за доўгі і гарачы дзень цяжкай працы, рабочыя накіроўваюцца па асьветленых драўляных тратуарах у кіно-тэатр, ці паслухаць радыё.

У гэтым новым горадзе, які завецца **Выдрыцай** і які вырас у мхох і лясох, ёсьць усё, што толькі патрэбна культурнаму чалавеку.

Ня кажучы нічога аб усім, што пабудавана і адрамантавана для «сталых» выдрыцкіх жыхароў—рабочых і тэхнічнага пэрсаналу, тут прадугледжана нават такая дробязь, як начлежка для прыезджых.

Гудок цягніка, грукат аўта-дрэзіны, манатонны піск электра-машын на станцыі, сьвятло, новыя будынкі і шматлюднасьць падкрэсьліваюць, што гразкае балота і дзікі лес ператвараюцца ў культурны і прамысловы асяродак.

А ўсяго толькі год таму назад у Выдрыцы быў чорны, закопчаны смалою будынак і адзін вялізарны комін. Кругом—лес, балота, вада.

Цяпер тут 1400 чалавек рабочых. Шмат служачых і тэхнічнага пэрсаналу. Тут робіцца мэліарацыя. Пакапаны і яшчэ капаюцца артэзіянскія студні.

Балота асушана

яшчэ зімою, калі было мёрзлае. Тады былі прабіты канавы, а вясною, калі ўжо нават пешу нельга было ўвайсьці, вада пачала сьцякаць у раку, і цяпер торф здабываецца амаль на сухім месцы.

Новыя, удасканаленыя торфакапалкі за сёлетні сэзон ужо апрацавалі чатыры з паловаю міліёны пудоў торфу. Увесь торф ляжыць на месцы здабычы і з наступленьнем марозаў будзе вывезен.

Асушкаю і мэліарацыяй падтрыхтован да эксплёатацыі вялізарны тарфяны масыў, які будзе „карміць" Асінаўскую электрастанцыю ў працягу 100 год.

Праз лес і палі ад Выдрыцы ідзе пейкая дзіўная лінія: адзін канец другога тры вялікіх слупы, на іх—дрот, які цягнецца ў паветры да наступнай тройкі. На слупох выразна намалёван чалавечы чэрап, а пад ім надпіс: «не чапаць, сьмяртэльна». Гэта высокавольтная лінія ў Арэхі і далей на торфардапрацоўкі. Па гэтай лініі машыны атрымліваюць электра-энэргію і капаюць торф, дробяць каменьні, мяшаюць цэмант і інш.

Па прасечанай праз лес і балота паласе насыпаюцца два пясчаныя насыпы. Гэта паласа ад Выдрыцы вядзе ў Арэхі. Насыпы рыхтуюцца для чыгункі і для шасы.

Над вёскаю Арэхі высока ўзьнялісь

тры камяніцы,

дамы для рабочых і служачых будуючай Асінаўскай электрастанцыі. Тут старое і новае відаць вельмі яскрава. чорныя, нізенькія і пахіленыя сялянскія хаты здаюцца карлікамі ў параўнаньні з гэтымі камяніцамі.

Маленькія сялянскія хаткі вёскі Арэхі. Яны як-бы памылкова папалі ў гэту балотную глушэ. Яны і ня марылі аб тым, што побач з імі вырасьце волат і церш за ўсё ўвальле праменьні электрычнага сьвятла пад нізкія, цёмныя, саламяныя стрэхі.

У параўнаньні з хаткамі, новы будынак, які ўжо пачаў будавацца, сапраўды волат. Каб звольніць для яго пляц, 26 сялянскіх хат вёскі Арэхі павінны будуць у хуткім часе разьвітацца з месцам, на якім яны стаялі сотні гадоў. Частка гэтых хат атрымае хутары, а рэшта—пасёлкі па некалькі двароў.

Балотна-тарфянае возера Арэхі, каля кілёматра ў шырыню і паўтара кілёматра ў даўжыню, шмат вякоў пралежала сярод тарфяных балот, парослых лесам. Яно як быццам пачало ўміраць: плыткія берагі пачалі зарастаць травою і кустамі, на ўсім яго абшары спляліся водарасьлі, а вада памутнела. Тарфянае дно возера пачало пухлець ад карэньняў водарасьляў, і месца для вады ў возеры пачало зьмяншацца.

Цяпер і возера аджыве. Арэхаўскі волат пачне смактаць праз вялізарную трубу яго ваду. Прайшоўшы па ўсіх волатаўскіх «жылах», па другой трубе вада пальлецца зноў у возера. І так яна будзе цыркуляваць увесь час.

Дзіўныя трохслуповыя электрычныя лініі, з чалавечымі чарапамі і з страшнымі надпісамі ад Арэхаўскага волата разыдуцца ва ўсе бакі: на Дуброўну, Віцебск, Магілеў.

Па дротах гэтай лініі пальлецца аджыўляючая нашу прамысловасьць таемная сіла.

Яшчэ зіма, яшчэ лета—і пасьля зімы пальлецца...

С. Азерскі.

БЫЎШЫЯ ЛЮДЗІ АРУДУЮЦЬ.

— Што гэта царская каса ашчадносьці ці савецкае крэдытнае таварыства? Што гэта?—Пытаюць адзін у другога сяляне Крупскага р.

І запраўды—што гэта? Усё праўленьне таварыства—«быўшыя людзі», з таемнымі, невядомымі рысамі. Ня нашы гэта людзі—і толькі.

Ціханаў П. М.—старшыня праўленьня, да самага 1919 г. трымаўся так-сяк у партыі, а потым „выляцеў" за рэлігійныя абрады; **Кавальскі П.** бухгальтар, быў калісьці «залатым чалавекам» дзяржымордай — афіцэрам, служыў у Крупскім камэндантска-этапным упраўленьні.

Абодвы яны шваграм, жанаты на дачках «его величества» пана Каўзьнера, жывуць „по старой привычке" ў адным доме. Сама—«ее светлость» пані Каўзьнер жыве з зяцямі. Грамадзкая праца, розныя сходы—гэта ня іх справа. Куды там прызнаваць розныя сходы, нарады, слухаць мужычых аратараў, лепш пасядзець у ціхім кутку, успоміць мінуўшчыну, такую салодкую, драмотную, праляцеўшую, нібы сон асеньні.

У таварыстве працуе яшчэ касір Лаўровіч Ф., а справаводам—Бенесон М. Гэтыя таварышы—супроцьлеглась ць папярэднім. Абое яны вядуць грамадзкую працу,—Лаўровіч працуе сябрам райгрупкому і сакратаром касы ўзаемадапамогі саюзу савгандзьслужачых, а Бенесон,—сябрам местачковага савету. Калі ім прыходзіцца вечарамі пайсьці на якое-небудзь пасяджэньне, то Кавальскі кажа:

— Когда вы пришли до нас работать, то должны работать день и ночь, никаких нагрузок и общественной работы не должны исполнять.

Яму падкажае сябра праўленьня Цітавец А., хаця сам і сябра партыі. Цітавец любіць выпіць, «каб чарцям тошна стала», вялікі лодыр, у таварыстве нічога ня робіць, па-казённаму і груба абыходзіцца з сялянамі.

Крэдыты з таварыства, прызначаныя беднаце, нейкім чынам попадаюць моцным кулацкім гаспадаркам. Так выданы імі доўгатэрміновы бяднацкі крэдыт на зямлеўпарадкаваньне кулаку Алісевічу І. І., які мае 10 дз. зямлі, 2 кані, 5 кароў, 2 цёлкі, 12 авец, 8 сьвіней і 20 калод пчол.

26 чэрвеня праўленьне выдае пазыкі сваім «любімчыкам» Альхімовічу І. В. на пабудову 80 р., які мае 10 дз. зямлі, 3 кані, 4 каровы і шмат дробнай жывёлы.

Яфімаву А. Г. на каня 100 р., які мае таксама шмат зямлі і конь яму зусім непатрэбен, бо Яфімаў служа ў Крупскім паштовым аддзяленьні і крыніцай яго існаваньня зьяўляецца служба. Паказаную суму выдаюць Яфімаву не ў часы заняткаў, а вечарам, у 10 гадз. У гэты-ж самы вечар, атрымаўшы такую вялікую суму, ад радасьці яны ўсёй кампаніяй (Цітавец, Ціханаў, Кавальскі і Яфімаў) накіраваліся ў «ангельскае кафэ»—прыватную піўную Гурэвіча, дзе і п'янствавалі ўсю ноч. Толькі ў дзьве гадзіны дня прышло «начальства» на службу.

А тут як на зло сялянс.

— Севодня нет кредита... Приходите... хоця-бы завтра,—праз сон адказваюць праўленцы вясковай беднаце, якая не адзін рабочы дзень патраціла на атрыманьне крэдыту.

Як зьдзекваюцца сябры праўленьня расказвае ўдава вёскі Шэйкі:

— Дзесяць разоў хадзіла... Усё адказваюць заўтра, заўтра... Валаводзяць толькі... а на вачох сьлёзы і злосьць, [illegible] злосьць...

У таварыстве маецца шмат [illegible] падарчасьці ў адносіне ўзысканьня пратэрмінаваных пазык. Як напала ўзысканьня гэтыя крэдыты. Судоваму выканаўцу не пераслана ніводнага выканаўчага ліста, а авансу пасьцелі ўжо выдаць у суме 90 рублёў.

Многа ёсьць крэдытаў, выданых «сваім людзям»—служачым крупскіх устаноў, якія ўжо пратэрмінованы па 3-4 месяцы. Некаторыя з гэтых «сваіх людзей» выехалі невядома куды. Праўленьне і ня думае сыскваць выданыя пазыкі.

— Успомніць... прынясуць калі-небудзь, гэта-ж свае людзі.

Гэта свой, асаблівы крупскі метад: «когда чего-либо как нибудь коснется, то наши товарищи безусловно нам окажут солидную помощь»...

І даюць, даюць усім крэдыты, даюць направа і налева, сьледчаму Шчокіну альбо фінінспэктару Санковічу ды ўсіх і не пералічыш.

Гэтага мала. Праўленьне таварыства 29 чэрвеня прадае агулам тавар спэкуланту м-ка Бобр Ландрэсу. 900 асялкоў для сялянскіх кос былі адпраўлены „для отсортировки и анализа" прыватніку, які ў вёсцы зрабіў належнае накладваньне і даражэй у два разы распрадаў іх сялянам.

Загатавіцелем ад с.-г. таварыства працуе нехта Шукайла Рывон, чалавек з цёмным мінулым, вялікі п'яніца.

З сялянамі абыходзіцца груба, крыє матам на кожным кроку. Памоцнікам Шукайлы працуе нехта Шпілевіч, уладьнік скуранога заводу, спэкулянт, чалавек, пазбаўлены голасу, ды к таму і не сябра саюзу. Калі яны загатаўляюць сыравіну, то ўзьнімаюць канкурэнцыю з Крупскім спажывецкім таварыствам. Акрсельсаюз дае лямітную цану ў 65 кап. за пуд лазовай кары, а Шукайла плаціць 75 к. Бывае шмат і такіх выпадкаў! Селянін вязе воз кары,—на яго накідваюцца два загатавіцелі ад крэд. і спаж. таварыстваў. Яны пачынаюць між сабой сварыцца і набіваць цану. Селянін, відома, вязе да таго, хто больш яму заплоціць.

Таварыства ад многіх загатовак зусім прыбытку ня мае, пераплачвае ўсюды і мае многа непатрэбных адміністрацыйна-накладных выдаткаў.

Усе сябры рэвізійнай камісіі, а таксама сябры савету таварыства, працай ня цікавяцца. Калі рэвізіі і былі, то такія «лишь-бы отделаться». Старшыня рэўкамісіі Сініцын несабра таварыства, Клімковіч П., сакратар РВК, таксама не сябры т-ва, ды к таму абое павінны выплаціць запазычанасьць т-ву, якая ўжо даўно пратэрмінавана. Даўно такая праца відна была ўсяму начальству, але ніякіх мер ня прымалася.

Так арудуюць «быўшыя людзі» ў каапэрадыйным т-ве, якое павінна пераводзіць сельскую гаспадарку на сацыялістычныя рэйкі.

Вон быўшых з таварыства.

м. Крупкі, Аршанскай акр.

Цім. Зарэчны.

КАЛЕКТЫЎНЫМ ШЛЯХАМ.

Шлях далейшага разьвіцьця сельскае гаспадаркі—шлях калектывізацыі і каапэраваньня. Гэты шлях яскрава вызначыў 15-ты зьезд нашае партыі. У сучасны момант гэтаму пытаньню надаецца шмат увагі як з боку партыйных, так і савецкіх установ. З часу 15-га зьезду шмат праароблена практычнае працы. Навакол справы калектывізацыі і каапэраваньня сельскае гаспадаркі ўзьнята савецкая грамадзкасьць. Але разьвіцьцё калектываў упіраецца ў шмат перашкодаў—перш усяго ў землеўпарадкаваньне, крэдытаваньне і практычную агранамічна-тэхнічную дапамогу. Для прыкладу прывядзём становішча двох калектываў, арганізаваных раней. На іх абгляде яскрава адбіваюцца дасягненьні і недахопы.

Калектыў імя „К. Маркса"

арганізаваны ў 1921 годзе на быўшай панскай зямлі па ініцыятыве партыйца. Другі калгас «Вольны Труд» арганізаваны ў 25 годзе, таксама на быўшай панскай зямлі. У першым налічваецца 6 сем'яў—28 душ працаздольных сябраў: мужчын—8, жанчын—7. Сацыяльны склад—1 парабак, 7 сялян-беднякоў, жанчыны ўсе хатнія гаспадыні, спэцыялістаў калгас ня мае. За 2 гады з калгасу выбыла 2 сем'і і прыбыло дзьве, прычыны выхаду з калгасу—уласнае жаданьне.

Кіруючы склад першага калгасу складаецца з 3-х сяброў, усе беднякі, адзін сябра партыі—7 год нязьменны старшыня гаспадаркі, карыстаецца аўтарытэтам сярод сялянства. Рэвізійная камісія таксама складзена з 3-х сяброў, але яна працуе дрэнна, у яе ўваходзяць нават непісьменныя сябры.

Арганізацыйная праца.

Арганізацыйнага плану працы калгас ня мае, праца паміж сябрамі разьмяркоўваецца вечарам, альбо раніцаю і ён яе робіць удзень. Наёмная праца калгас карыстаецца ў выключных выпадках, галоўным чынам, пры сезоннай працы.

Прыбытак гаспадаркі ў канцы году разьмяркоўваецца паміж сябрамі і па разьліку затрачаных працоўных дзён за год.

Валавы прыбытак гаспадаркі за 27-28 год складаў 16996 руб.; чыстага прыбытку гаспадарка мела 5568 рублёў.

З гэтае сумы 400 руб. пайшло ў непадзельны капітал, у зваротны капітал—3300 руб., 1467 руб. разьмеркавана паміж сябрамі, рэшта на розныя выдаткі.

Становішча гаспадаркі.

Зямлі пахаты калгас мае—48 дзесяцін, сенажаці—24, саду—паўтары дзесяціны. На аднаго едака прыпадае пахаты і сенажаці прыблізна—2 з пал. дзесяціны; у абкружаючага насельніцтва прыпадае на едака паўтары дзесяціны. Землеўпарадкаваньне калгас правёў у 1923 годзе. Калгас цалкам перайшоў на шматпольны севазварот. У палеводзтве калгас пераважна мае збожжавыя культуры. Ураджайнасьць з дзесяціны жыта 100 пуд., аўса—50 пуд.. Калгас мае 19 дойных кароў і 9 штук маладняка. Будынкамі калгас забясьпечан, мае адну камяніцу. Цягавая сіла калгасу складаецца з 7 коняй і 8 штук маладняка. Гаспадарка мае жнярку, сенакасілку, малатарню, саламарэзку, раскіданую сёялку, сарытроўку, карнарэзку і інш. машыны. Становішча з інвэнтаром можна лічыць здавальняючым.

Крэдытаў за калгасам да сучаснага моманту лічыцца 3545 руб.

Арганізацыйна-гаспадарчае абслугоўваньне.

Калгас мае вытворчы плян, які выконваецца на 85 процантаў. Агрономы наведваюць гаспадарку, але выстарчаюча не даюць практычных паказаньняў. Нават не дапамагаюць складаньню вытворчага плану, мала затрымоўваюцца ў калгасе, часьцей бываюць праездам. Інструктар сельсаюзу наведвае калгас толькі ў часе справаздачных сходаў, прычым затрымліваецца прыблізна на суткі ня больш.

Калгас збывае свае прадукты праз каапэрацыю і толькі ў каапэрацыі купляе сабе ўсё неабходнае. Ніякіх непаразуменьняў на гэтым грунце ў сэнсе забясьпечаньня няма.

Культурна-масавая праца.

Гэты бок справы вельмі культэгас. Калгас мае, апрача дзяцей, 6 чал. няпісьменных і ніякае працы па ліквідацыі гэтае няпісьменнасьці не вялося За ўвесь час існаваньня калгасу ні агрономамі, ні лектарамі, ні іншымі культсіламі ніводнае лекцыі ня было прачытана.

Праца сярод жанчын зусім не вядзецца. У грамадзкія арганізацыі Мопр, ТДА-Авіяхіму, «Праф Няпісьменнасьць» ня ўсе сябры ўцягнуты.

Партыйным уплывам калгас забясьпечан слаба.

Узаемаадносіны з насельніцтвам.

Калгас з акружаючым насельніцтвам мае добрыя ўзаемаадносіны. Дапамагае вясковай беднаце, як прыладамі, так і насеньнем. Маецца алучны пункт, які абслугоўвае жывёлу бедноты бясплатна. Калгас у сучасны момант пазычае беднаце жыта на хлеб да новага ўраджаю. Заможнікі да калгасу адносяцца варожа—: «захапілі даромна добрую зямлю—вось і жывуць лепш».

Калгас „Вольны Труд"

складаецца з 7 сем'яў яўрэйскага жыхарства. Сацыяльнае становішча сяброў—адзін рабочы, адзін земляроб, тры ламавыя возчыкі, два былых арандатары сыраварні і саду. Працаздольных сяброў—15. Мужчын—10, кабет—5. Партыйцаў няма. Кіруючы склад такі, як і ў першым калгасе, толькі дрэнна справа з рэвізіяй, ніякіх сьлядоў яе працы няма.

Арганізацыйны бок працы адрозьніваецца тым, што тут яшчэ горш справа з унутраным распарадкам. Наёмная працай тут карыстаюцца ў больш выпадках, чым у першым, нават найманюць для полева гародаў, капаньня бульбы і г. д.

Прыбытак разьмяркоўваецца бяз вучоту. Дакладныя лічбы адсутнічаюць, нават непрацоўныя сябры, вучні, атрымліваюць у канцы году 10 проц. ад 250 руб. Валавы капітал павялічыўся з 1400 р. да 2600 р.

Становішча гаспадаркі

наступнае: зямлі ральні калгас мае 36,93 дзес., выгану—3 дзес., сенажаці—13 дзес., сядзібы—2 дзес., саду—2 дзес. Ральля па якасьці добрая. На аднаго едака прыпадае 1,40 дзес. Акруговае насельніцтва мае 0,90 дзес. Калгас землеўпарадкаваны ў 1926 годзе. Пляну ўпарадкаваньня няма. Ураджайнасьць крыху ніжэйшая ад першага калгасу.

Калгас мае: кароў 30 шт., маладняку 10 шт. Корміцца жывёла ўзімку па норме—3 разы у дзень праз 8 гадзін. Аборы ня вельмі добрыя, няма вокнаў, кармушак, не хапае подсьціла. Прыбытак ад жывёлаводзтва складае 40 проц. Калгас мае ўласную сыраварню, якая мае вялікае значэньне для гаспадаркі з жывёлаводчым ухілам. Маецца паравы млын, які ў сучасны момант не працуе—вымагае капітальнага рамонту.

Коняй—6 шт., маладнака—3 шт. Цягавай сілы хапае для гаспадаркі.

Надворныя будынкамі калгас забясьпечан. Жыльлёвыя будынкі дрэнныя. Будуецца новы дом, які пры стараньні можа быць скончаны да восені.

Інвэнтаром калгас забясьпечан поўнасьцю, нават мае конную малатарню і бульбакапалку.

Калгас крэдытамі забясьпечан, нават больш таго,—атрыманыя крэдыты на пабудаваньне дому скарыстаны не па прызначэньні, але з прычыны дрэннага вучоту нельга высьветліць, на што скарыстаны грошы.

Арганізацыйнае абслугоўваньне

пастаўлена ня лепш, а нават горш, чымся ў першым. Да гэтага году калгас збываў свае прадукты прыватнікам, і ў сучасны момант гэты бок справы яшчэ не ўпарадкаван. З боку сельска-гаспадарчай каапэрацыі калгас забясьпечваецца правільна і своечасова, за выключэньнем лепшага гатунку жывёлы.

Культурна-масавая праца.

Гэты бок працы пастаўлен дрэнна. Маецца 5 чалавек няпісьменных. Ліквідацыі няпісьменнасьці не праводзіцца. Ні ў якія грамадзкія арганізацыі сябры ня ўцягнуты і нават арганізацый ніякіх няма. Каапэраваны толькі адзін сябра.

Сярод жанчын праца не вялася.

Сувязі з вакольчым насельніцтвам

калгас як гаспадарчай, так і масава-выхаваўчай ня мае. Ніякай дапамогі насельніцтву калгас не дае, паказальным і ўзорным для сельскае гаспадаркі не зьяўляецца.

На падставе вышэй пададзеных фактаў і лічбаў аб становішчы гэтых калгасаў можна зрабіць наступныя вывады.

Абодвы калгасы па гаспадарчай моцнасьці зьяўляюцца жыцьцёвымі.

«Вольны Труд» ня мае ніякае сувязі з насельніцтвам і грамадзкімі органамі, агрыкультурных вучасткаў няма, гатунковае насеньне ня ўводзіцца, сябры калгасу не зьяўляюцца сябрамі

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра ўстанаўленьне разьмераў арэндной платы за муніцыпалізаваныя будынкі, прызначаныя для жыльля.

Каб упарадкаваць эксплёатацыю муніцыпалізаваных будынкаў, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Арэндная плата за муніцыпалізаваныя будынкі ўстанаўляецца гарадскімі і местачковымі саветамі, а дзе іх няма—раённымі выканаўчымі камітэтамі ў залежнасьці ад даходнасьці будынкаў, паводле артыкулаў 2-10 гэтае пастановы.

2. Гадавая арэндная плата за муніцыпалізаваныя жылыя будынкі ўстанаўляецца ў разьмеры кошту амартызацыі будынкаў, гэта значыць, у залежнасьці ад таго, якія гэта будынкі (драўляныя ці каменныя) ад 1 да $1^1/_2$ процантаў будаўнічага кошту будынку, вылічанага да часу здачы яго ў аренду па сярэднім для данага гораду кошце будаўніцтва адзінкі плошчы.

3. Гадовая арэндная плата за будынкі, даход з адзінкі жылой плошчы якіх не перавышае $^3/_4$ установленай у даным горадзе асноўнай квацярнай таксы, бярэцца ў разьмеры ня больш $^1/_2$ кошту амартызацыі (арт. 2).

4. Арэндная плата не бярэцца з будынкаў, у якіх даход на адзінку жылой плошчы ня больш $^1/_2$ паказанай асноўнай квацярнай таксы. Калі-ж у далейшым даходнасьць будынку павялічыцца і перавысіць паказаную вышэй меру, то да іх ужываюцца нормы арэндной платы, паказаныя ў артыкуле 3, што павінна быць прадугледжана дагаворам арэнды.

5. Калі ў муніцыпалізаваных будынках чысты даход з адзінкі жылой плошчы перавышае ўстаноўленую ў даным горадзе асноўную квацярную таксу, то ў арэндную плату ўваходзяць таксама і проценты на будаўнічы кошт будынкаў, як адлічэньні арандатарамі лішкаў даходаў.

Паказаныя адлічэньні ўстанаўляюцца гарадскімі і местачковымі саветамі альбо райённымі выканаўчымі камітэтамі ў разьмеры ад 40 да 60 процантаў з сумы лішкаў, што не перавышаюць $^1/_2$ асноўнай квацярнай таксы, і ў разьмеры 70 процантаў з астатняй сумы лішкаў.

Увага. Калі будынак, які здаецца ў аренду, патрабуе адноўчага рамонту і арандатар бярэ на сябе абавязак зрабіць адбудоўчы рамонт, то ён аслабяняецца ў працягу часу, устаноўленага дагаворам, ад адлічэньня паказаных у гэтым артыкуле лішкаў даходаў.

6. Арандатары дамоў павінны весьці справаздачнасьць аб прыбытках і выдатках паводле форм, устаноўленых Народным Камісарыятам Унутраных Спраў і ўгодненых з Народным Камісарыятам Фінансаў.

Увага: Формы справаздачнасьці па жылішчна-арэндных каапэратыўных таварыствах пляпярэдне распрацоўваюцца Беларускім Саюзам Жыльлёвай Каапэрацыі.

7. Гэта пастанова не пашыраецца на будынкі, цалкам занятыя ўстановамі, што бяруць на сябе рамонт і ўтрыманьне будынкаў і не эксплёатуюць будынкі праз здачу памяшканьняў у субарэнду.

Арэндная плата за капазаныя ў гэтым артыкуле будынкі бярэцца паводле пастановы СНК БССР за 4 ліпеня 1927 году „Аб аплаце памяшканьняў, занятых у муніцыпалізаваных дамох, а таксама дамох, якія падпарадкаваны жыльлёвым таварыствам" (З. З. БССР 1927 г., № 34, арт. 178).

8. Калі ў складзе будынкаў, якія здаюцца ў аренду, ёсьць гандлёвыя, гандлёва-прамысловыя і складавыя памяшканьні, і калі арандатарамі будынкаў зьяўляюцца дзяржаўныя ўстановы і прадпрыёмствы, каапэрацыйныя арганізацыі ўсіх відаў, прафесіянальныя і іншыя грамадзкія арганізацыі, то памянёныя памяшканьні павінны здавацца гэтым арандатарам разам з жылымі памяшканьнямі. Пры гэтым арэндная плата за гандлёвыя, гандлёва-прамысловыя і складавыя памяшканьні бярэцца па тарыфу—мінімум за адзінку плошчы, устаноўленага асобным законам.

Увага: Гарадзкія і местачковыя саветы і райённыя выканаўчыя камітэты маюць права пры здачы ў аренду будынкаў з гандлёвымі, гандлёва-прамысловымі і складавымі памяшканьнямі рабіць памянёным у гэтым артыкуле арандатарам скідку з устаноўленага тарыфу мінімум альбо зусім ня брать арэндной платы ў залежнасьці ад райёну, дзе знаходзяцца гэтыя памяшканьні, становішча пасобных будынкаў і іншых умоў.

9. Зданыя арандатарам (арт. 8) гандлёвыя, гандлёва-прамысловыя і складачныя памяшканьні здаюцца імі ў субаренду на падставах і паводле тарыфаў, устаноўленых асобным законам.

10. З часткі даходаў ад гандлёвых, гандлёва-прамысловых і складачных памяшканьняў, якая перавышае ўстаноўлены ў даным горадзе тарыф—мінімум за адзінку плошчы, 70 процантаў ідзе ў арэндную плату, як адлічэньне, прадугледжанае артыкулам 5 гэтае пастановы.

11. Народнаму Камісарыяту Ўнутраных Спраў, пасьля ўзгадненьня з Народным Камісарыятам Фінансаў, даручаецца выдаць інструкцыю пра ўжываньне гэтае пастановы, у пасобнасьці, прадугледзіць у гэтай інструкцыі парадак устанаўленьня даходнасьці домаўладаньня, а таксама нагляд за своечасным і правільным складаньнем домакіраўніцтвамі прыхода-расходных кашторысаў домаўладаньня.

Час. вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Сташэўскі.

21 ліпеня, 1928 г.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об установлении размеров арендной платы за муниципализированные строения, предназначенные для жилья.

В целях урегулирования эксплоатации муниципализированных строений, Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1. Арендная плата за муниципализированные строения устанавливается городскими и местечковыми советами, а где их нет—районными исполнительными комитетами, в зависимости от доходности строений, согласно статьям 2-10 настоящего постановления.

2. Годовая арендная плата за муниципализированные жилые строения устанавливается в размере стоимости амортизации строений, то-есть, в зависимости от рода строений (деревянные или каменные) от 1 до 1 с пол. процентов строительной стоимости строений, исчисленной к моменту сдачи его в аренду по средней для данного города строительной стоимости единицы площади.

3. Годовая арендная плата за строения, доход с единицы жилой площади которых не превышает $^3/_4$ установленной в данном городе основной квартирной таксы, устанавливается в размере не свыше $^1/_2$ стоимости амортизации (ст. 2).

4. Арендная плата вовсе не взимается со строений, доход с единицы жилой площади которых не превышает $^1/_2$ основной квартирной таксы. Если же в будущем доходность строения увеличится и превысит указанный выше предел, то к этим строениям применяются нормы арендной платы, указанные в статье 3, что должно быть предусмотрено договором аренды.

5. Если в муниципализированных строениях чистый доход с единицы жилой площади превышает установленную в данном городе основную квартирную таксу, то в состав арендной платы за эти строения включаются также и проценты на строительную стоимость строений в виде отчислений арендаторами излишков доходов.

Указанные отчисления устанавливаются городскими и местечковыми советами или районными исполнительными комитетами в размере от 40 до 60 процентов с суммы излишков, не превышающих $^1/_2$ основной квартирной таксы и в размере 70 проц. с остальной суммы излишков.

Примечание: Если строение, сдаваемое в аренду, нуждается в производстве восстановительного ремонта и арендатор принимает на себя обязательство производства его, то он освобождается в течение срока, установленного в договоре, от отчисления указанных в настоящей статье излишков доходов.

6. Арендаторы строений обязаны вести отчетность о приходах и расходах по строению по формам, установленным Народным Комиссариатом Внутренних Дел и согласованным с Народным Комиссариатом Финансов.

Примечание. Формы отчетности по жилищно-арендным кооперативным товариществам предварительно разрабатываются Белорусским Союзом Жилищной Кооперации.

7. Настоящее постановление не распространяется на строения, целиком занимаемые учреждениями, принимающими на себя ремонт и содержание строения и не занимающимся эксплоатацией строений путем сдачи помещений в субаренду. Арендная плата за указанные в настоящей статье строения взимается в порядке постановления СНК БССР от 4 июля 1927 года «Об оплате помещений, занятых в муниципализированных домах, а также в домах, находящихся в ведении жилищных товариществ» (С. З. БССР 1927 г., № 34, ст. 178).

8. Если в состав строений, сдаваемых в аренду, имеются торговые, торгово-промышленные и складочные помещения, и если арендаторами строений являются государственные учреждения и предприятия, кооперативные организации всех видов, профессиональные и другие общественные организации, то упомянутые помещения должны сдаваться этим арендаторам вместе с жилыми помещениями. При этом арендная плата за торговые, торгово-промышленные и складочные помещения взимается по тарифу минимум за единицу площади, устанавливаемому особым законом.

Примечание. Городские и местечковые советы и районные исполнительные комитеты имеют право при сдаче в аренду строений с торговыми, торгово-промышленными и складочными помещениями делать поименованным в настоящей статье арендаторам скидку с установленного тарифа-минимум или же вовсе освобождать от арендной платы в зависимости от района расположения этих помещений, состояния отдельных строений и других условий.

9. Сданные арендаторам (ст. 8) торговые, торгово-промышленные и складочные помещения сдаются ими в наем на основаниях и по тарифам, установленным особым законом.

10. С части дохода от торговых, торгово-промышленных и складочных помещений, превышающей установленный в данном городе тариф-минимум на единицу площади, 70 процентов поступает в арендную плату, как отчисление, предусмотренное статьей 5 настоящего постановления.

11. Народному Комиссариату Внутренних Дел, по согласованию с Народным Комиссариатом Финансов, поручается издать инструкцию по применению настоящего постановления, в частности предусмотрев в означенной инструкции порядок установления доходности домовладения, а также наблюдение за своевременным и правильным составлением домоуправлениями приходо-расходных смет домовладений.

Вр. исп. об. Председателя Центрального Исполнит. Комитета БССР А. Хацкевич.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

За Секретаря Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Сташевский.

21 июля, 1928 г.
г. Минск.

ХРОНІКА.

У гасьцях у артылерыстаў.

У лягерах Ж-га артпалку ў нядзелю было вялікае сьвята.

Да чырвонаармейцаў прыехалі прадстаўнікі ўраду і працоўных гораду Менску. У гэты дзень Менскі гарадзкі савет, а разам з ім і ўсе працоўныя Менску прынялі шэфства над Ж-м артпалком.

Прыехаў да чырвонаармейцаў часова выконваючы абавязкі старшыні ЦВК БССР А. І. Хацкевіч, ад Менскага гарсавету прыехалі ў лягеры т. т. Рабіновіч, Пасынкоўскі і іншыя сябры прэзыдыуму гарсавету.

Прыехалі да чырвонаармейцаў і члены гарсавету—рабочыя і работніцы, а таксама і прымацаваныя да савету дэлегаткі.

Адчыняецца кароткі мітынг.

Тав. Хацкевіч вітае чырвонаармейцаў і пераменьнікаў ад імя ўраду і ўказвае на задачы, якія стаяць перад Чырвонай арміяй у справе абароны краіны саветаў. Выступалі таксама тав. Лакціонаў і тав. Рабіновіч і др.

З адказнай прамовай ад Чырвонай арміі выступіў чырвонаармеец, які запэўніў прадстаўнікоў ураду і працоўных Менскай акругі і гораду Менску ў тым, што Чырвоная армія з кожным днём узмацняе сваю баяздольнасьць у шчыльным саюзе з рабочай клясай і яна заўсёды гатова бараніць з аружжам у руках заваёвы Вялікага Кастрычніка.

Пасьля мітынгу тав. Хацкевіч прымае чырвоную прысягу ад маладых пераменьнікаў.

Прысяга скончана. Нам. старшыні Менскага гарсавету тав. Рабіновіч абвяшчае пастанову гарсавету аб прыняцьці шэфства над Ж-м артпалком і перадае сьпяг апошняму.

— Шэфства яшчэ больш узмоцніць сувязь працоўных Менску з нашай Чырвонай арміяй.

Работніца Русановіч заяўляе, што працоўныя Менску ваенізуюцца і разам з Чырвонай арміяй рыхтуюцца даць у патрэбны момант адпор нападаючаму ворагу. Працоўныя заўсёды клапаціліся аб сваёй Чырвонай арміі, а пасьля прыняцьця шэфства будуць яшчэ больш клапаціцца і аказваць чырвоным байцам пасільную дапамогу.

Прадстаўнікі Ж-га артпалку запэўнілі, што Чырвоная армія ў саюзе з рабочымі і сялянамі стаіць на варце і робіць агульную справу будаўніцтва сацыялізму.

Пасьля параду, чырвоныя байцы паказалі сваім часьцям як танкі ходзяць праз усялякія прапынкі, ламаюць дрэвы і г. д.

Чырвонаармейцы запрасілі гасьцей на абед, пасьля якога паказалі свае дасягненьні ў справе вайсковай падрыхтоўкі,—былі наладжаны скачкі з прыпынкамі, фэхтаваньне, выступленьне фізкультурнікаў і г. д.

Толькі к вечару чырвонаармейцы адвезьлі сваіх гасьцей у горад.

Калі будзе адчынен Дом Селяніна.

Зараз праводзіцца ўнутранае абсталяваньне Цэнтральнага Дому Селяніна ў Менску. Укладаецца падлога, устаўляюцца вокны, праводзіцца цэнтральнае ацапленьне і інш. Знадворку, у 2-х вуглавых нішах, будуць зроблены лепшыя аздобы, якія будуць сымбалізаваць інтэнсіфікацыю нашай сельскай гаспадаркі і, наогул, наш агульны га рост.

Урачыстае адчыненьне Дому адбудзецца 7 лістапада ў часе сьвяткаваньня дню Кастрычнікавай рэвалюцыі, імя якой надаецца Дому.

Прабег матацыклістаў Мілан—Масква.

Два члены т-ва „Аўтадор" Савецкага консульства ў Мілане (Італія) учора, 30 ліпеня, праехалі праз Менск на матацыклах па напрамку на Бабруйск.

Матацыклісты робяць прабег Мілан—Масква.

Праездам праз Менск матацыклісты наведалі Цэнтральнае Праўленьне Аўтадору БССР.

Абгаварэньне 5-цігадовага пляну аховы здароўя.

На падставе пастановы Савнаркому БССР, Нар. Кам. Аховы Здароўя і даў указаньне ўсім інспектарыятам аховы здароўя аб неабходнасьці абгаварэньня 5-ці гадовага пляну па ахове здароўя на прафсаюзных сходах, буйных дэкавых устаноў і г. д. Гэтае мерапрыёмства дасьць магчымасьць шырокім працоўным масам ужсыці ў 5-ці гадовым плане па ахове здароўя неабходныя зьмены і дадаткі.

Пашырэньне вучэбна-вытворчых майстэрняў.

Вучэбна-вытворчыя майстэрні Менскай інспэкцыі народнай асьветы ў бліжэйшым часе пераходзяць у новае памяшканьне. Для гэтых майстэрняў гарсавет адпусьціў будынак былой фабрыкі Харліца па Гандлёвай вуліцы. На рамонт будынку затрачана каля 13.000 руб. Менскі гарсавет адпусьціў 2000 руб. на перавод і пашырэньне майстэрняў. Будуецца спэцыяльнае памяшканьне для пашыраючайся сталярнай майстэрні. Дагэтуль у майстэрнях навучалася 130 беспрытульных дзяцей, а з пераходам у новае памяшканьне майстэрні захопяць 150 дзяцей.

Інстытут аховы працы.

Адчыніўся ў новым памяшканьні (рог вул. Карла Маркса і Энгельса № 44-23) Інстытут аховы працы. Пры інстытуце арганізован музэй працы, які можна аглядаць па аўторках і пятніцах ад 6 да 8 гадзін увечары і ў суботу ад 10 да 2 гадзін удзень.

Наведваньні экскурсантаў на папярэдніх заняўках, уваход дарэмны.

Земляўпарадкаваньне працоўных яўрэяў.

Па вестках Белазэту, на Калінкавіцкім фондзе ўжо земляўпарадкавана 40 яўрэйскіх сем'яў.

У бягучым годзе ўжо засеяна 34 гэктары.

Зараз праводзяцца карчавальныя работы для падрыхтоўкі плошчы да пасеву азімых. У бягучым годзе намечана пабудаваць 10 жылых і халодных будынкаў.

Да арганізацыі трэсту швэйнай прамысловасьці.

Эканомнарада пры СНК БССР пастанавіла в першага кастрычніка бягучага году арганізаваць трэст швэйнай прамысловасьці БССР шляхам аб'яднаньня 3 існуючых прадпрыемстваў: Менташвею, Вітшвею і Гомшвею.

Дажджы перашкаджаюць мэліярацыі.

З прычыны дажджлівай пагоды сёлета заўважаецца нездавальняючы тэмп разьвіцьця мэліяцыйных работ. Асабліва дрэнна разварачваюцца работы ў Віцебскай акрузе.

У Мэтадкоме Наркамасьветы.

Навукова-Мэтадычны камітэт пастанавіў выпусьціць „Мэтадычны дапаможнік па дашкольнаму выхаваньню" в тыражом у 2000 экземпляраў.

Мэтадычны ліст аб працы фарпосту ў школе зацьвердзіў мэтадком. Гэты ліст будзе ўключаны ў зборнік «Выхаваўчая праца школы».

Самковіч і Пратасэвіч склалі «Сынтаксыс беларускай мовы ў нагляданьнях і назіраньнях». Мэтадком зацьвердзіў яго ў якасьці падручніка для II канцэнтру сямёхгодак, ШСМ, прафшкол і рабфакаў.

Падручнік нямецкай мовы склалі Пецольд і Залеская. Мэтадком дапусьціў гэты падручнік для школ самёхгодак.

10000 экземпляраў зборніку выхаваўчая праца школы вып. 1-ы—„Самакіраваньне і грамадзка-карысная праца школы" будзе выдадзена к новаму навучальнаму году.

Апрацавана праграма па сьпевах для школ сямёхгодак. Мэтадком пастанавіў прасіць Выдавецтва выдаць зборнік песень паводле гэтай праграмы.

Прыём заяў у 3-хгадовую школу мэдычных сясьцёр.

Сёлета прыём заяў у 3-хгадовую школу мэдычных сясьцёр Беларускага т-ва Чырвонага Крыжу праводзіцца выключна праз акруговыя камітэты Чырвонага Крыжу.

Прыём заяў па Менскай акрузе ўжо закончан. Усяго паступіла 170 заяў. З гэтае колькасьці будзе прынята ў школу 20 чал.

Арганізацыя кніжнай базы па сан-асьвеце.

Цэнтральным Камітэтам Беларускага т-ва Чырвонага Крыжу арганізавана кніжная база па санітарнай і мэдычнай літаратуры.

Нар. Кам. Аховы Здароўя ў сувязі з гэтым запрапанавае усім акруговым інспэктарыятам аховы здароўя закупіць літаратуру праз гэту базу, якая будзе рабіць максымальную скідку.

Падрыхтоўка трактарыстаў.

Ворыва на калёнізацыйных фондах будзе праводзіцца трактарамі, дзеля чаго будуць арганізоўвацца трактарныя атрады.

Для падрыхтоўкі патрэбнага ліку трактарыстаў у наступным годзе будуць арганізаваны 3-хмесячныя курсы трактарыстаў на 50 чалавек.

Мерапрыёмствы да захаваньня асушальных каналаў.

З 1-га кастрычніка будзе адменены збор за сплаў лесу па асушальна-сплаўных каналах БССР. У мэтах захаваньня гэтых каналаў і каналізаваных рэчак, па якіх сплаўляецца лес, усе лесаплаўчыя арганізацыі па скончаньні работ па сплаву будуць абязаваны рабіць ачыстку каналаў ад дроў, кары, астаткаў вязачнага матар'ялу і інш.

Арганізацыя насенных фондаў.

Да 1-га кастрычніка 1928 г. усе камітэты сялянскай узаемадапамогі БССР павінны арганізаваць насенны фонд у 500 тысяч пуд. збожжа.

У працягу бліжэйшых 5 год ёсьць намер давесьці насенны фонд камітэтаў узаемадапамогі да 1200 тысяч пуд. У сярэднім у кожным сельсавеце будзе ў запасе да 700 пуд. збожжа.

С у д.

Заслаўскія „каапэратары".

Апошнія тры гады ў Заслаўскім спажывецкім таварыстве працавалі: Казлоў—старшынёй праўленьня, Казлоўскі—членам праўленьня і закупшчыкам тавараў і Сушко—бухгальтарам. Уся гэта тройка спэцыяльнымі махінацыямі растраціла звыш 6000 р. каапэрацыйных грошай і, урэшце, апынулася пад судом.

Паводле даных папярэдняга сьледзтва, справа мяркуецца ў наступным выглядзе:

Казлоў—старшыня праўленьня—лічыў сябе кампэтэнтнай асобай; пэнсія, якую ён атрымліваў, не здавальняла яго шырокага жыцьця, і ён пачаў шукаць сродкаў, якія дапамагалі-б яму разбагацець. Дзеля гэтага ён засноваў блёк з падчынёнымі—Казлоўскім і Сушко, і ён распачаў працу.

Сувязь з прыватнымі гандлярамі—Брукам, Каганам і іншымі, у якіх яны закупляілі тавары для каапэрацыі як за наліччы разрахунак, так і пад вэксалі, далі нажыву каапэратарам—каля 2000 р.

Далей, „спэцы" распачалі фальсіфікацыю вэксаляў. Вэксалі, фактуры і рахункі падрабляліся так лоўка, што здавалася справа абстаіць вельмі добра і нічога злачыннага няма.

Цікава тое, што ў студні бяг. году каапэратары Казлоў, Казлоўскі і Сушко разам з старым складам рэвізійнай камісіі аллічыліся перад пайшчыкамі: замоста растраты, у іх выявіўся фікцыйны прыбытак на 6000 р.

Пайшчыкі слухалі справаздачу, радаваліся, што каапэрацыя расьце і пашыраецца. Казлоў нават атрымаў падзяку ад пайшчыкаў і зноў быў абраны ў склад новага праўленьня.

Бухгальтэрыя была знарок заблытана бухгальтарам Сушко, які часамі і сам ня мог разабрацца ў сваіх запісах.

Калі ў склад новага праўленьня па рэкамендацыі камфракцыі былі абраны партыйцы—Цыбулька і іншыя, адразу пачалі выяўляцца балячкі, растраты, падлогі і іншыя злоўжываньні «спэцаў»—Казлова і яго сяброў.

Справа заслаўскіх каапэратараў у хуткім часе будзе разглядацца выязной сэсіяй Менскага акруговага суду на месцы, у м. Заслаўі і з удзелам пракурора.

Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

За кражу.

Грамадз. г. Менску Алесь Мацеяў Багдановіч, які судзіўся за кражу некалькі разоў, упачы в 23 на 24 мая г. г., шляхам узлому вакна ў кватэры гр. Труса, пакраў разныя рэчы, з якімі і затрымаў на ніжнім рынку. Нарсуд 2 вучастку Менскай акругі прыгаварыў: Алеся Багдановіча на два гады вызволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем у правох на тры гады на адбыцьці пакараньня з адзначэннем Багдановічу працаваць у буйных гарадох Беларусі у працягу 3-х год.

Хацеў нажыцца.

Грамад. г. Менску Савасьцей Уснаў, на Стара-Слабодзкай вуліцы, у сябе на кватэры займаўся гандлярствам рускай горкай, бяручы з пакупацеляў па 30—40 к. дарожай дзяржаўнай цаны на літар. Нарсуд 2 вучастку прыгаварыў: Савасьцея Уснава на адзін год вызволеньня, але прымаючы пад увагу стары ўзрост Уснава, суд паменшыў пакараньне да 4 месяцаў вызволеньня без канфіскацыі маемасьці.

АБ ПАПАЎНЕНЬНІ С-Г. І ПРАМ. МУЗЭЮ ПРЫ Ц. ДОМЕ СЕЛЯНІНА.

У красавіку гэтага году Цэнтральны Дом Селяніна зьвярнуўся да шмат якіх устаноў з просьбай аб прыняцьці імі ўдзелу ў папаўненьні экспанатамі сельска-гаспадарчага і прамысловага музэю.

У сваёй просьбе ЦДС зазначыў, што зацікаўленасьць музэем з боку яго даведчыкаў, галоўным чынам, сялян, узрасла настолькі, што пры тэй колькасьці экспанатаў, якія маюцца ў музэі, немагчыма ў далейшым нармальна праводзіць работу, тым больш, што ў гэтым годзе дзейнасьць музэю будзе перанесена ў новы будынак ЦДС, дзе запатрабаваньне даведнікамі музэю да набыцьця розных ведаў будуць яшчэ большыя.

Да гэтага, в пераходам у новы будынак, музэй ставіць перад сабою наступныя задачы:

Быць жывым паказальнікам навукова-тэхнічных і практычных дасягненьняў у сельскай гаспадарцы і прамысловасьці для пазашкольнай сельска-гаспадарчай асьветы сялян, чырвонаармейцаў, вучняў, рабочых і інш.

Выяўляць перад працоўнымі масамі галоўныя сельска-гаспадарчыя працэсы ў іх паступовасьці в боку найбольшай тэхнічнай і эканамічнай рэнтабельнасьці.

Дэманстраваць у музэі бягучую плянава-апэрацыйную работу дасьледчых станцый, сельска-гаспадарчых каапэрацый, сельска-гаспадарчых навучальных устаноў, дзяржаўных устаноў, якія вядуць культурна-тэхнічную работу ў сельскай-гаспадарцы і прамысловасьці ў мэтах змычкі сялянства і рабочага, навукі і практыкі.

Распаўсюджваць сельска-гаспадарчыя веды і прапагандаваць дзяржаўныя мерапрыёмствы па аднаўленьні сельскай гаспадаркі.

Выконваць функцыі кансультацыйнага характару ў мэтах садзейнічаньня агранамічнай дапамогі насельніцтву.

Зьбіраць і захоўваць усе найбольш каштоўныя і характэрныя ўзоры сельскай гаспадаркі, сельска-гаспадарчай і інш. прамысловасьці.

Далей ЦДС зазначае, што ажыцьцявіць вызначаныя задачы можна пры шчыльнай і жывой сувязі з музэем навучальных, гаспадарчых, адміністрацыйных, грамадзкіх і іншых устаноў.

Ня гледзячы на тое, што ЦДС зварочваўся з просьбай больш як да 30 устаноў, зацікаўленасьць да гэтага праявілі толькі 5.

Вэтэрынарнага ўпраўленьня, Дзяржкапрат, Леніраўніцтва, Менакраза і Белсельсаюз.

Памянёныя ўстановы зразумелі, што музэй пры ЦДС можа адыграць вялікую ролю ў іх жыцьці, што музэй зьяўляецца найлепшым месцам, дзе можна прапагандаваць іх ідэю сярод сялян, прыехаўшых са ўсіх куткоў Беларусі, што мэта заўсёды апрацаваць сродкі, якія будуць патрачаны на набыцьцё экспанатаў для абсталяваньня адпаведных аддзелаў у музэі.

Чым-жа можна тлумачыць адсутнасьць зацікаўленасьці ў пабудове музэю іншых устаноў?

Няўжо яны мысляць, што музэй можа будавацца толькі адной установай?

Калі-б ЦДС і абыйшоў усе ўстановы, і у далейшым, як і да гэтага часу, будаваў музэй адзін, дык рэшта зацікаўленых устаноў павінна была-б заўважыць ЦДС на ненармальнасьць такога зьявішча, зазначыўшы пры гэтым, што ў пабудове музэю павінна ўдзельнічаць усё насельніцтва, а тым больш усе ўстановы.

Музэй у сувязі з інш. установамі в посьпехам можа выканаць усе тыя задачы, якія выпадаюць на яго долю в пераходам у новы будынак ЦДС.

Тут штодня будзе зварочвацца звыш 200 ч. сялян. Каму, як ня гэтай масе земляробаў прадэманстраваць тыя ці іншыя дасягненьні, атрыманыя дасьледчымі станцыямі, альбо пры наліччы адпаведных экспанатаў, паказаць сялянам перавагі, якія маюць калектыўныя гаспадаркі перад асобнымі.

Маем надзею, што ў блізкім часе, усё-ж такі належныя ўстановы патрубуюць прыняць удзел у папаўненьні экспанатамі сельска-гаспадарчага і прамысловага музэю, што так важна і патрэбна для больш спрыяючай работы музэю ў дапамозе селянству будаваць гаспадарку на новых началах.

А. С.

Нам адказваюць.

— Па сутнасьці допісу „Усяго на трохъ" Каралінскі райвыканком паведамляе, што некаторыя факты, указаныя ў допісе, сьцьвердзіліся. Загадчыку хаты-чытальні дадзены ўказаньні аб палепшэньні працы.

— На допіс «Самаатойныя каапэратары» („С. Б." № 130) атрыманы адказ, у якім высьвятляецца, што ня выдача сялянам крамніны па квітках аг-тва. Дзяржагандлю ўзамен ільнавалакна тлумачыцца адсутнасьцю ў той час крамніны, таксама не пацьвердзіўся факт абмену галёш на крамніну з прыватнікам.

Што тычыцца нядобрых адносін спажывтаварыства да Дзяржгандлю, то гэтыя факты мелі месца. У гэтым напрамку прынялі адпаведныя захады і дадзены папярэджаньні аб недапушчэньні ў далейшым гэтых выпадкаў.

— На допіс аб ня водпуску гр-цы Качан Праскоўі лесу, Вушацкі райвыканком паведамляе, што дармовы лес ёй ня быў адпушчан толькі з тэй прычыны, што дармовага лесу не хапіла нават для здавальненьня нагарэльцаў. У 1928-29 г. пры водпуску лесаматар'ялаў гр-ка Качан будзе мецца на ўвазе.

— Мазырскі акрыканком на допісу „Ці будзе сёлета ў нас землеўпарадкаваньне" паведамляе, што землеўпарадкаваньне вёскі мал. Аўцюцовічы ў 1928 г. правесьці ня было магчымасьці в прычыны нехваткі каморнікаў.

Але лічачыся в необходнасьцю землеўпарадкаваньня вёскі М. Аўцюцовічы, Калінкавіцкі райвыканком будзе дамагацца правядзеньня землеўпарадкаваньня памянутай вёскі ў 1929 г.

— У адказ на допіс т. Дуклавала „Валаніта ў землеўпарадкаваньні" («С. Б.» № 26—31-I 28 г.) атрымана паведамленьне, у якім гаворыцца, што пасьля доўгай перапіскі і ўпартай барацьбы бедняку з заможнікамі справа аб выдзяленьні гр. вёскі Альхоўка на пасёлак Акрэзмаддзелам канчаткова разгледжана і вацьверджана. Насельніцтва прыступіла к новаму землекарыстаньню.

— Допіс «Ведь кажется ... ков союзных, не то что ... вядае сапраўднасьці.

Дзелавод Плешчаніцкага ... віч працуе на найму в 1916 г., ... ніцтва з 1924 г. У камплуку гр. ... віч займае выбарчую пасаду і вяўляецца актыўным сябрам саюзу. З гаспадаркай сваіх братоў сувязі ня мае і права на ... згубіў.

— Згодна вытвараванага Смалявіцкім райённым камітэтам КП(б)Б расьсьледваньня, допіс, пад загалоўкам «Як Хадыка праводзіў самазбкладаньне»—не адпавядае сапраўднасьці.

— На допісу „Лес гамоніць" нас паведамляюць, што старшыня Жыватлюдаўскага сельсавету гр. Санюковіч запраўды перавысіў прадстаўленыя яму законам правы а пагэтаму прыцягваецца да адказнасьці па 1 ч. 106 арт. Кр. К.

Апавяшчэньні.

СХОД ПАРТАКТЫВУ.

— У сераду, 1 жніўня, а 7 гадзіне ўвечары, у летнім тэатры саду „Прафінтэрн" склікаецца ўрачыстае паседжаньне ЦК, ЦКК, АК і АКК КП(б)Б сумесна з партактывам менонай партарганізацыі па пытаньню аб 25 годзьдзі II зьезду партыі. Дакладчык т. Кнорын.

На актыў запрашаюцца ўсе старыя бальшавікі, знаходзячыяся ў Менску.

Сябры ЦК, ЦКК, АК, АКК бюро ЦК і АК ЛКСМБ уваходзяць на сваіх мандатах.

Астатнія таварышы атрымліваюць білеты па райкомах.

МЕНАКРУГКОМ КП(б)Б.

ПАСЯДЖЭНЬНЕ САВЕТУ Т-ВА «БЯЗБОЖНІК».

— У аўторак, 31 ліпеня, а 7 гадз. увечары, у памяшканьні клюбу савгандальслужачых адбудзецца паседжаньне акруговага савету таварыства «Бязбожнік», на дзе запрашаюцца ўсе цікавячыяся гэтым пытаньнем.

На павестцы дню даклад т. Пакроўскага аб чарговых задачах антырэлігійнай працы.

Па сканчэньні—кіно.

Уваход па членскіх кніжках прафсаюзаў.

НАРАДА ПА ПЫТАНЬНЯХ АНТЫАЛКАГАЛІЗМУ.

— У сераду, 1 жніўня, а 12 гадз. увечары, у памяшканьні АПА менакругкому КП(б)Б сьляцца неадбыўшаяся ў панядзелак, 23 ліпеня, нарада па пытаньнях антыалкагалізму.

На нараду запрашаюцца т. т. Баровкоў, Самойлаў, Ашаровіч, Ліўшыц, Нісенбаум, д-р Афонскі, праф. Кроль, т. Гальбрайх, Кроліч (Шкловавод), д-р Нейфах (Дом Саньасьветы), Мазур (НКАсьветы), Дзекцярэў (НК Працы), Слупскі (ЦСУ), Шапіра (вэндыспансэр), Баран (тубдыспансэр), Кац (Чырв. Крыж), Гальдвасэр (Белжыласаюз), Галкін (Белдзяржкіно), Канакопін (радыёперадача), Кроль (Міліцыя), прадстаўнікі ЦРК, саюзу Нарпіт і ЦБ Пралетэтуду.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— У сераду, 1-га жніўня, а 7 гадз. увечары ў памяшканьні Дому Асьветы адбудзецца чарговы далегацкі сход Гаррайёну ўсіх 3-х груп.

Ёўна ўсіх дэлегатак абавязкова.

На дэлегацкі сход таксама запрашаюцца работніцы.

У парадку дню: Даклад Нарасьветы аб выніках навучальнага 27-28 г. і далейшыя задачы.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

(НА 31-VII 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—63, куп. 4—61.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—16, куп. 5—14.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—07,5, куп. 5—05,5.

Абл. 10 пр. паз. 27 году —прад. 25,97, куп. 25—87.

Абл. дзярж. паз. 26 г. — прад. 122, куп. 120.

Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 102—02, куп. 101—99.

Абл. 6 проц. паз. індустр. прад. 25—19 куп. 25—09.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ТЭАТР—КІНО.

ЛЕТНІ САД КІНО «КУЛЬТУРА». Савецкая, 71. Мастацкі фільм „ЗЯЛЁНЫ ШУМ". ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ГАСТРОЛІ МАРІ ДАНСКОЙ са сваімі сэнсацыйнымі нумарамі.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". З аўторка 31 ліпеня пасьля доўгага перапынку зноў на нашым экране папулярная актарка МАРЯ ЯКОВІНІ ў фільму „У ПЛЫВУЧЫМ ДОМЕ". Драма ў 7 частках.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». ТОЛЬКІ 3 ДНІ. ГРАНДЫЁЗНЫ ФІЛЬМ. „ГІШПАНСКАЯ ТАНЦОРКА" у 8 частках. Каса адчынена з 5 г. Пач. 1-га сэансу а 7 гадз. 30 хв.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». У зьвязку з рамонтам, зачынена да 7 жніўня.

Галоўлітбел 302.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ БУХГАЛТЕРИИ, КАЛЬКУЛЯЦИИ И СТАТИСТИКИ ПРИ Ц. К. С. Б.

— Продолжительность курса—8 МЕСЯЦЕВ. —

Поступать на курсы можно в любой месяц года.

Принимаются лица с образованием не ниже 4 гр. семилетки.

ОКОНЧИВШИМ КУРСЫ ВЫДАЮТСЯ